Сямейная газета



**Любоў — гэта дзеяслоў**



**Былінка на ветры**



**Жывая гісторыя партызанскага атрада**

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 САКАВІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 54 (28164) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Горад, дзе будуюць «Мір»



У цэнтры сталіцы, у раёне аэрапорта Мінск-1, распачалася будоўля новага жылога і бізнес-комплекса «Мінск-Мір».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Безумоўна, сітуацыя ў нашай рэспубліцы і ў суседніх краінах, з якімі Беларусь традыцыйна звязана эканамічна, няпростая. Але калі кіраўнік прадпрыемства — мэтанакіраваны, валявы чалавек, які адказна і творча ставіцца да сваёй справы, арыентуе працоўны калектыў на вырашэнне сур'ёзных задач, то — насуперак негатыўным знешнім з'явам — прадпрыемства дасягае пастаўленых амбіцыйных мэт».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20161,00 | ▼ |
| Еўра | 22566,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 297,89 | ▲ |
| Укр. грыўня | 769,85 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ТАРЫФАМ ВЫЗНАЧАНЫ МЕЖЫ

**Прэзідэнт падпісаў Указ №107 «Аб аплаце жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву»**

Дакументам вызначаюцца гранічна дапушчальныя цэны (тарыфы) у 2016 годзе на 14 відаў жыллёва-камунальных паслуг. Указ прадугледжвае змену шасці тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

У мэтах зніжэння фінансавай нагрузкі для насельніцтва ўказам памяншаюцца тарыфы на паслугі водазабеспячэння ў 1,7 раза (з Br4765,9 да Br2790 за 1 куб.м), водаадвядзення — больш чым у 2,2 раза (з Br4148,8 да Br1863 за 1 куб.м). Акрамя таго, вызначаецца гранічны тарыф на паслугу па тэхнічным абслугоўванні запорна-перагаворных прылад (кодавыя дзверы, дамафоны і іншыя) жылога дома ў памеры Br9100 на адну кватэру (раней ён не быў устаноўлены).

Палажэннямі дакумента змяняюцца падыходы да налічэння платы за тэхнічнае абслугоўванне ліфта, санітарнае ўтрыманне (прыборку) дапаможных памяшканняў жылога дома, электраэнергію на асвятленне месцаў агульнага карыстання, работу дапаможнага абсталявання ў залежнасці ад колькасці грамадзян, якія пражываюць у кватэры.

Для больш аб'ектыўнага вызначэння платы за паслугі, кошт якіх разлічваецца, зыходзячы з колькасці грамадзян, якія пражываюць у кватэры, ва ўказе устаноўлена норма, што прадугледжвае спагнанне платы за карыстанне ліфтам і прыборку дапаможных памяшканняў з жыхароў, якія маюць жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання і прыватнага жыллёвага фонду па дагаворы найму.

Указ уступае ў сілу з дня падпісання і распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі з 1 студзеня 2016 года.

**Тэкст Указа можна знайсці на zviazda.by.**

# АРЫЕНТАЦЫЯ НА ВЫНІК

**Сутнасць перамен у кіраванні дзяржаўнымі фінансамі**

**У нашай краіне распачата бюджэтная рэформа. Насамрэч яна пачалася яшчэ 25 гадоў таму, з дня абвяшчэння незалежнасці Беларусі, і ніколі не прыпынялася. Штогод у бюджэтнай сістэме адбываюцца змены, якія закранаюць значную частку яе агентаў — гэтыя змены дыктуе час. Аднак цяпер урад выстройвае якасна новую сістэму бюджэтных адносін, і пачаў ён з кіравання фінансамі. У снежні была зацверджана адпаведная стратэгія. Пра тое, у чым заключаецца сутнасць цяперашняй трансфармацыі, мы запыталі першага намесніка міністра фінансаў Максіма ЕРМАЛОВІЧА.**



## НОВАЯ ЯКАСЦЬ

***— Максім Леанідавіч, вы ўваходзіце ў склад міжведамаснага савета па пытаннях рэалізацыі стратэгіі рэфармавання кіравання дзяржаўнымі фінансамі. Патлумачце, з чаго гэта стратэгія складаецца?***

— Базіс усяго рэфармавання — пераход з кантролю расходавання на кантроль выніковасці. Гэта дзве зусім розныя рэчы. Пры кантролі расходаў мы можам забяспечыць поўнае выкананне ўмоў і мэт атрымання бюджэтных сродкаў, але не дабіваемся пры гэтым канчатковага выніку, якога чакаюць падаткаплацельшчыкі. Каб яго дабіцца, трэба пераарыентаваць сістэму справаздачнасці і забяспечыць аўдыт эфектыўнасці бюджэтных сродкаў. Калі мы не будзем дасканала кантраляваць, куды і хто траціць грошы (на гэта ўжо ні сіл, ні сродкаў не хапае), а будзем глядзець, якую якасць бюджэтнай паслугі атрымлівае насельніцтва, мы атрымаем добры вынік, прычым хутка.

Мэта адна — павысіць эфектыўнасць выкарыстання бюджэтных грошай. Павінна змяніцца сутнасць узаемаадносін паміж дзяржаўнымі органамі: атрымальнік сродкаў — гэта выканаўца пэўнай паслугі, а дзяржаўны орган у асобе міністэрства, аблвыканкама ці райвыканкама — заказчык. Ацэньваць жа якасць бюджэтных паслуг павінны грамадзяне. Адносіны неабходна выстраіць такім чынам, каб кожны атрымлівальнік патрэбную інфармацыю. Калі гэта запрацуе так, як у іншых краінах, што пайшлі далёка наперад у рэформах сваіх бюджэтных адносін, гэта прынясе вынік, на які мы разлічваем.

СТАР. 4

Звязда. Да чытача з любоўю!
ВЫ ЯШЧЭ ПАСПЯВАЕЦЕ ПАДПІСАЦЦА НА «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2016 ГОДА!

# Пры наяўнасці волі з двух бакоў

## Беларусь і Польшча могуць адыграць значную ролю ў Еўропе і паўплываць на многія працэсы

**Такую думку выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Польшчы Вітальдам Вашчыкоўскім.**

«Жывём побач, гісторыя, здаецца, адна і тая ж, часта перажываем адны і тыя ж праблемы, у кагосьці іх больш, у кагосьці менш, а шлях міністра з Варшавы ў Мінск аказаўся такім доўгім», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, бакам ёсць пра што пагаварыць. «Не скажу, што ёсць праблемы, якія нам цяжка ацаніць. Нават не скажу, што гэтыя праблемы або пытанні цяжка вырашальныя. Пры наяўнасці волі з двух бакоў мы іх можам вырашыць, прытым любыя. Галоўнае — дамовіцца аб крытэрыях. І тут, я думаю, праблем не будзе», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што беларускі бок стане зыходзіць з тых крытэрыяў выстройвання адносін, на якіх грунтуецца польская знешняя палітыка. «Як вы абараняеце свой суверэнітэт і незалежнасць, так і мы будзем абараняць. Тут у нас абсалютна няма разыходжанняў. Нават часам падглядаем у вас, як гэта рабіць. Як вы ажыццяўляеце сацыяльна-эканамічную палітыку ўнутры краіны, так і мы будзем рабіць. Пры гэтым будзем старацца рабіць так, каб ніхто нас ніколі не папракнуў у малой дэмакратыі, у адсутнасці яе. Мы будзем так рабіць, каб яе было не менш, чым у Польшчы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў польскаму боку за тое, што там бачаць Беларусь суверэннай і незалежнай. «Калі партнёры, з якімі мы вядзём дыялог, будуць настойваць на тым, вы з Усходам ці з Захадам — выбірайце, гэта значыць вы з Расіяй ці Еўразаюзам, ставіць нас перад такім выбарам, нам такая пазіцыя не падыходзіць. Я абсалютна ўпэўнены, што і вам яна сёння не патрэбна. Думаю, што Польшча больш, чым хто-небудзь, зацікаўлена, каб Беларусь была не толькі незалежнай дзяржавай, але і стабільнай», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Разам з вамі мы можам адыграць значную ролю, знаходзячыся ў эпіцэнтры еўрапейскага кантынента. І разам мы можам значна паўплываць на многія працэсы, якія тут адбываюцца. У нашых інтарэсах, у інтарэсах Польшчы і Беларусі, але ні ў якім разе не на шкоду нашым суседзям», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Але і свайго мы не аддадзім. Гэта ваша пазіцыя, гэта і наша пазіцыя», — дадаў беларускі лідар.

Кіраўнік нашай дзяржавы выказаў надзею, што пасля візіту польскага міністра ў Беларусь краіны будуць больш інтэнсіўна развіваць двухбаковыя адносіны. «Нядобра нам глядзець адзін на аднаго праз агароджу, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы заўсёды знаходзілі агульную мову. Хацелася б, каб так было і цяпер».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь гатова на самае цеснае супрацоўніцтва з Польшчай.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што краіны маюць агульную гісторыю, шмат этнічных беларусаў жыве ў Польшчы, як і палякаў у Беларусі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што людзі ўсіх нацыянальнасцяў у Беларусі карыстаюцца роўнымі правамі і ён асабіста надае гэтаму шмат увагі. «Я павінен усё зрабіць для таго, каб яны нармальна жылі. Гэта пазіцыя непахісная, мяне ніхто не перакане ў адваротным», — падкрэсліў Прэзідэнт. Што датычыцца рэлігійных пытанняў, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што і тут беларускую ўладу няма ў чым папракнуць, паколькі ніхто не перашкаджае наведваць чалавеку той храм, які ён лічыць патрэбным. «Я вельмі роўна да ўсіх стаўлюся. Так будзе і ў далейшым», — падкрэсліў беларускі лідар.

Калі Польшча вітае такія падыходы, то бакі хутка вырашаць пытанні, якія ёсць сёння на парадку дня або з'явяцца ў будучыні, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Вітальд Вашчыкоўскі падкрэсліў, што новы польскі ўрад лічыць ненармальнай сітуацыю, калі на працягу многіх гадоў суседнія краіны не размаўлялі. «Таму мы вырашылі без усялякіх папярэдніх умоў пачаць дыялог і ўрэгуляваць усе суседскія адносіны, якія можна будзе вырашыць у найбліжэйшы час», — сказаў ён.

На сустрэчы быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў двухбаковых адносін, міжнароднага парадку дня, у тым ліку рэгіянальнай бяспекі. Шмат увагі бакі ўдзялілі разгляду пытанняў эканамічнага супрацоўніцтва, адзначыўшы вялікі патэнцыял у рэалізацыі інтэграцыйных праектаў з улікам транзітнага становішча Беларусі і Польшчы.

# СЯБРУЕМ РЭГІЁНАМІ

**Пратакол намераў аб супрацоўніцтве быў падпісаны ўчора ў Магілёве падчас рабочага візіту губернатара Арлоўскай вобласці Вадзіма Патомскага разам з прадстаўнічай дэлегацыяй у Беларусь.**

У размове са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Уладзімірам Даманеўскім кіраўнік Арлоўскай вобласці падтрымаў памкненні палепшыць сувязі ў эканамічнай, культурнай, адукацыйнай галінах.

— Патэнцыял вельмі вялікі, — згодны з калегам Вадзім Патомскі. — Прадукцыя Беларусі карыстаецца вялікім попытам у Расіі, яе кошт адпавядае даходам насельніцтва. У кожнага прамысловага або сельгаспрадпрыемства ёсць тэхніка беларускай вытворчасці — камбайны, прадукцыя Мінскага трактарнага завода. Мы прыехалі абмеркаваць агульныя эканамічныя планы дзеяння, дамовіцца пра стварэнне сумесных прадпрыемстваў.

У хуткім часе будзе падпісана пастанова ўрада Расійскай Федэрацыі аб стварэнні асаблівай эканамічнай зоны ў Арлоўскай вобласці, дзе падатак на прыбытак не будзе перавышаць 2%. У Магілёўскай вобласці такая зона ўжо паспяхова існуе. Кіраўнікі абласцей лічаць гэтыя ўмовы вельмі спрыяльнымі для супрацоўніцтва.

— Супрацоўніцтва нашых дзвюх СЭЗ стане першым праектам сумеснай дзейнасці, які не быў пакуль што ажыццёўлены ні з адным з рэгіёнаў, — паведаміў Вадзім Патомскі карэспандэнту «Звязды». — Мы паглядзім, як у рамках дзвюх свабодных эканамічных зон стварыць нейкі прадукт, які дазволіць яшчэ больш палепшыць і эканамічную, і інвестыцыйную прывабнасць. Наша задача зрабіць так, каб узаемна прыцягнутыя інвестыцыі былі выгадныя для развіцця двух рэгіёнаў. Ідэя ўзнікла толькі што, падчас нашай размовы, засталося ўсё эканамічна падлічыць. Калі гэтыя лічбы будуць цікавыя і маржынальныя, будзем да іх імкнуцца.

— Спадзяёмся, што тыя сустрэчы на вышэйшым узроўні, якія чакаюць нашых гасцей у гэтыя дні, толькі паспрыяюць узмацненню нашых узаемаадносін, — падкрэсліў Уладзімір Даманеўскі. — Мы ж на сваім узроўні дамовіліся стварыць працоўныя групы з прадстаўнікамі Арлоўшчыны і нашага рэгіёна, каб выпрацаваць найбольш прымальныя пункты ўзаемадзеяння. Каб гэта была не толькі эканоміка, але і культурныя, і адукацыйныя сувязі, каб нашы школьныя калектывы знайшлі новых сяброў. Хацелі б, каб наш райцэнтр Крычаў атрымаў горад-пабрацім у Арлоўскай вобласці. Гэта была б адна з прыступак далейшых узаемадзеянняў паміж рэгіёнамі. Каб сувязі паміж старэйшымі пакаленнямі абавязкова перайшлі да маладых.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# У буйной вагавай катэгорыі

**Наша краіна мае ўсе шанцы прыняць міжнародныя спаборніцтвы па цяжкой атлетыцы. Аб гэтым ішла размова падчас сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком Міжнароднай федэрацыі гэтага алімпійскага віду спорту Тамашом Аянам.**

Наша краіна ўжо прымала падобныя мерапрыемствы высокага ўзроўню і атрымала станоўчую ацэнку Міжнароднай федэрацыі цяжкой атлетыкі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: калі ў федэрацыі ёсць жаданне працягваць супрацоўніцтва, то Беларусь арганізуе спаборніцтвы належным чынам. «У нас усё ёсць неабходнае: дастатковая колькасць гасцініц, пляцовак сусветнага ўзроўню для правядзення спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Тамаш Аян прапанаваў Беларусі ўзяць удзел у конкурсе на правядзенне чэмпіянату свету па цяжкай атлетыцы сярод дарослых, які плануюць правесці ў 2019 годзе. Гэтыя спаборніцтвы стануць кваліфікацыйным алімпійскім турнірам перад летняй Алімпіядай у Токіа 2020 года. Чакаецца, што прэтэндаваць на права правядзення ЧС будуць 4-5 краін. Беларускі бок з удзячнасцю прыняў прапанову МФТА.

Кіраўнік МФТА ацаніў як добрыя шанцы Беларусі атрымаць права на правядзенне юніёрскага і маладзёжнага ЧС па цяжкай атлетыцы, якія павінны прайсці ў найбліжэйшыя гады.

Акрамя таго, на сустрэчы згадвалася магчымасць правядзення ў 2017 годзе ў Беларусі буйной антыдопінгавай канферэнцыі. Абмяркоўваючы гэтую прапанову, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь робіць і будзе рабіць яшчэ больш для падтрымання ўсіх міжнародных ініцыятыў у барацьбе з допінгам.

## ■ Парламенцкі дзённік

# ЧЭШСКІМ ІНВЕСТАРАМ ПРАПАНАВАЛІ СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ

**Падчас знаходжання ў Чэхіі парламенцкая дэлегацыя нашай краіны на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктарам Гумінскім сустрэлася са старшынёй Сената парламента Чэхіі Міланам Штэхам. Як паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, бакі абмеркавалі шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва.**

Пытанні гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва дзвюх краін былі разгледжаны і падчас сустрэчы нашай дэлегацыі з выканаўчым дырэктарам Чэшскай гандлёва-прамысловай палаты па краінах СНД Францішкам Масапустам. На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні ўдзелу беларускіх і чэшскіх суб'ектаў гаспадарання ў выставачных мерапрыемствах і інвестыцыйных форумах у Беларусі і Чэхіі. Як паведамляецца, кіраўніцтву гандлёва-прамысловай палаты перададзены пакет перспектыўных інвестыцыйных прапаноў для магчымай рэалізацыі зацікаўленымі чэшскімі кампаніямі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2015 г.**

**Открытое акционерное общество**

## «Брестский радиотехнический завод»

224023, г. Брест, ул. Московская, 248, тел. (0162) 41-09-84, факс (0162) 42-51-59

**Основные виды деятельности:** производство электронно-вычислительных машин и другого оборудования для обработки информации, производство бытовых электрических машин и приборов.

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 г.** (млн. руб.)

| АКТИВ | Код стр. | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **Основные средства** | 110 | 9091 | 8756 |
| **Нематериальные активы** | 120 | 1 | 7 |
| **Доходные вложения в материальные активы** | 130 | - | - |
| **Вложения в долгосрочные активы** | 140 | 36 | 20 |
| **Долгосрочные финансовые вложения** | 150 | 3 | 3 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **9131** | **8786** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **Запасы** | **210** | 4768 | 6319 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 1195 | 1272 |
| незавершенное производство | 213 | 1322 | 756 |
| готовая продукция и товары | 214 | 2251 | 4291 |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | 4 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | 16 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2623 | 2731 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 3116 | 375 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **10507** | **9445** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **19638** | **18231** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код стр.** | **На 31 декабря 2015 г.** | **На 31 декабря 2014 г.** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| **Уставный капитал** | 410 | 12104 | 12104 |
| **Резервный капитал** | 440 | 1820 | 1820 |
| **Добавочный капитал** | 450 | 1707 | 1707 |
| **Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)** | 460 | 11 | 622 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **15642** | **16253** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **Долгосрочные кредиты и займы** | 510 | - | - |
| **Отложенные налоговые обязательства** | 530 | 4 | 4 |
| **Доходы будущих периодов** | 540 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **4** | **4** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **Краткосрочные кредиты и займы** | 610 | 177 | - |
| **Краткосрочная часть долгосрочных обязательств** | 620 | - | - |
| **Краткосрочная кредиторская задолженность** | **630** | 3815 | 1974 |
| **Обязательства, предназначенные для реализации** | 640 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **3992** | **1974** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **19638** | **18231** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2015 г.** (млн. руб.)

| Наименование показателей | Код стр. | За январь–декабрь 2015 г. | За январь–декабрь 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | 010 | 26715 | 31726 |
| **Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг** | 020 | 23130 | 27319 |
| **Валовая прибыль (010-020)** | **030** | **3585** | **4407** |
| **Управленческие расходы** | 040 | 3998 | 4135 |
| **Расходы на реализацию** | 050 | 512 | 573 |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)** | **060** | **-925** | **-301** |
| **Прочие доходы по текущей деятельности** | 070 | 4442 | 3491 |
| **Прочие расходы по текущей деятельности** | 080 | 4768 | 3994 |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080)** | **090** | **-1251** | **-804** |
| **Доходы по инвестиционной деятельности** | **100** | **1646** | **2919** |
| **Расходы по инвестиционной деятельности** | **110** | **852** | **1042** |
| **Доходы по финансовой деятельности** | **120** | **61** | **2** |
| **Расходы по финансовой деятельности** | **130** | **215** | **231** |
| **Иные доходы и расходы** | **133** | **-** | **-** |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130+140)** | **140** | **640** | **1648** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения (090+150)** | **150** | **-611** | **844** |
| **Налог на прибыль** | **160** | **-** | **227** |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | 43 |
| **Чистая прибыль (убыток) (160-170+180+190-200)** | **210** | **-611** | **574** |
| Количество прибыльных организаций | 211 | - | 1 |
| Сумма прибыли | 212 | - | 574 |
| Количество убыточных организаций | 213 | 1 | - |
| Сумма убытка | 214 | -611 | - |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| **Совокупная прибыль (убыток) (210+220+230)** | **240** | **-611** | **574** |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | -1542 | 1450 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | - | - |

Обеспеченность одной акции имуществом общества – 39 510 руб.
Количество акционеров всего – 981, в том числе юридических лиц – 1, физических лиц – 980.
Доля государства в уставном фонде эмитента 93,1%.
Среднесписочная численность работающих – 133 чел.
Собрание акционеров проведено – 18 марта 2016 г.
По решению собрания в связи с допущенными убытками по итогам работы за 2015 год и отсутствием прибыли – дивиденды за 2015 год не выплачивать. Эмитент применяет следующие правила корпоративного поведения: Положение об аффилированных лицах, регламент работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20% и более выручки от реализации: Производство электронно-вычислительных машин и другого оборудования для обработки информации – 35,2% (7 967 млн. рублей). Производство бытовых электрических машин и приборов – 32,1% (7 258 млн. рублей).

УНП 200273907

## Извещение о проведении 06 апреля 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-7025745, общая площадь 624,8 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 25 | 5 908 912 800 | 59 000 000 |
| 2. | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 18 792 732 000 | 1 500 000 000 |
| 3. | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 246 281 280 | 24 000 000 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск

**Организатор торгов:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **06 апреля 2016 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 25.03.2016 по 01.04.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»); (017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).**

## ■ Дыялог бізнесаў

# УЗАЕМАДАПАЎНЯЛЬНЫЯ ЭКАНОМІКІ

### За кошт чаго павялічым тавараабарот з Грузіяй?

**У Мінску адбыўся беларуска-грузінскі бізнес-форум. На адной платформе прадстаўнікі больш як 50 беларускіх кампаній правялі дзелавыя перамовы з 27 буйнымі кампаніямі Грузіі. Абодва бакі шукалі новых партнёраў у сферах машынабудавання, вытворчасці прадуктаў харчавання і алкагольных напояў, страхавання, нафтахімічнай прамысловасці, фармацэўтыкі.**

Паводле слоў **прэм'ер-міністра Андрэя КАБЯКОВА**, важную ролю ў развіцці беларуска-грузінскага партнёрства адыгрывае ўзаемная дапаўняльнасць эканомік дзвюх краін. Грузія экспартуе харчовую прадукцыю, якую Беларусь не можа вырабляць у сілу кліматычных умоў. Наша краіна, у сваю чаргу, пастаўляе шырокую гаму машынабудаўнічай прадукцыі, якая не выпускаецца ў Грузіі. Ужо цяпер беларускі бок бачыць перспектыву ў стварэнні на тэрыторыі Грузіі зборачнай вытворчасці беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі, ліфтавага абсталявання.

«Ёсць і іншая наша прадукцыя, запатрабаваная на грузінскім рынку, у тым ліку малочная, прадукцыя дрэваапрацоўкі, шыны, лекавыя сродкі, мінеральныя ўгнаенні», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Таксама ён лічыць, што дзвюм краінам ёсць што прапанаваць адна адной і ў сферы паслуг. Акрамя ўсяго, Грузія зацікаўлена ў вопыце беларускіх IT-кампаній. Як адзначыў **віцэ-прэзідэнт грузінскай кампаніі «ICTBC» Давід ЦЭКВАВА**, некалькі буйных грузінскіх кампаній у сферы IT зацікаўлены ў сумесных праектах з беларусамі, якія ў апошні час сур'ёзна пазіцыянуюць сябе на сусветным рынку інфармацыйных тэхналогій.

У 2015 годзе тавараабарот паміж Беларуссю і Грузіяй склаў 44,9 млн долараў. Сёлета ў студзені тавараабарот ужо склаў 2 млн 624,9 тыс. долараў і павялічыўся на 8,7% у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

# Skype і Viber — на ранейшых умовах

**ААЦ растлумачыў палажэнні Указа №98 «Пра ўдасканаленне парадку перадачы паведамленняў электрасувязі».**

Як адзначаюць спецыялісты, рэалізацыя дакумента не закране такіх папулярных і масавых інтэрнэт-месенджараў, як Skype, Viber. Аднак варта мець на ўвазе, што злучэнне павінна адбывацца наўпрост паміж месенджарамі, а таксама калі ўладальнікі месенджараў складуць дагаворы пра ўзаемадзеянне з беларускімі аператарамі, у тым ліку на тэрмінацыю IP-трафіку наўпрост на беларускія тэлефонныя сеткі сувязі. Такая інфармацыя змяшчаецца ў каментарыях указа Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Тлумачэнні змешчаны на сайце ААЦ.

У каментарыі ААЦ адзначаецца, што ў краіне атрымала распаўсюджанне практыка ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці па аказанні паслуг перадачы галасавых паведамленняў электрасувязі з парушэннем патрабаванняў заканадаўства, што прад'яўляюцца да дзейнасці ў вобласці электрасувязі (так званы «шэры трафік»), асобамі, якія не маюць статусу аператара электрасувязі.

Фактычна такія асобы, карыстаючыся інфраструктурай аператараў электрасувязі і складаючы праз падстаўных асоб дагаворы на аказанне паслуг электрасувязі (доступ да інтэрнэту, прадастаўленне мабільнай сувязі і іншых відаў паслуг, што прапануюцца аператарамі, напрыклад «Максіфон»), займаюцца незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

## ■ Пенсійны ўзрост

# ПЕРАСТАЎ ПРАЦАВАЦЬ — ВОСЬ І ДЭПРЭСІЯ

**Міністэрства аховы здароўя падтрымлівае прапанову аб павышэнні пенсійнага ўзросту. Днямі на адкрыцці чарговага Беларускага медыцынскага форуму міністр аховы здароўя Васіль Жарко падкрэсліў у размове з журналістамі, што чаканая працягласць жыцця значна вырасла ў апошнія гады. Скарачаецца і разрыў паміж чаканай працягласцю жыцця мужчын і жанчын, а таму ідэю павышэння пенсійнага ўзросту трэба лічыць правільнай. Што ж, вядома нямала, скажам, вялікіх танцоўшчыкаў і артыстаў балета, якія пасля 60-ці маглі выконваць тыя ж па, што і ў маладосці. Відавочна, захаваць добрую фізічную форму і псіхічнае здароўе, актыўнае (!) даўгалецце цалкам магчыма — было ж жаданне, лічыць і дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў ВАРОНІНА.**

***— А сама неабходнасць працаваць даўжэй можа паспрыяць таму, каб мы больш актыўна змагаліся за сваё здароўе?***

— Неабходнасць працаваць доўга адназначна прымушае чалавека думаць пра сябе, клапаціцца аб тым, каб захаваць здароўе, актыўнасць і маладосць. І ў першую чаргу гэта актуальна для маладых людзей. Калі мы будзем мець на ўвазе тых, каму зараз 50+, то сярод іх немалая колькасць жыве з установкай «дзяржава мне абавязана», «займацца фізкультурай ці ўжываць алкаголь — мая справа», і гэту катэгорыю ўжо не зменіш.

***— Што можна сказаць пра стан здароўя беларусаў ва ўзросце пасля 60-ці?***

— Што называецца, у адных яно ёсць, а ў іншых... Адна справа экалогія (і яе шкодны ўплыў таксама нельга скідваць з рахунку), але ёсць моманты, якія цалкам залежаць ад нас саміх. Відавочна, што ў нашай краіне вельмі распаўсюджаны дрэнныя звычкі і амаль не распаўсюджаны звычкі добрыя. Для некаторых народаў вытворчая гімнастыка — норма. Людзі рознага ўзросту выходзяць на свежае паветра і займаюцца! А вось злоўжыванне алкаголем там не норма. У нас жа наадварот: не прывыклі мы працаваць над сабой. Ужываем велізарную колькасць тлушчаў, а садавіны, агародніны, рыбы — мізэр. Адсюль лішняя вага і як наступства — сардэчна-сасудзістая, эндакрынная, анкалагічная і іншая паталогія. Проста большасць усё яшчэ лічыць, што аб'ём таліі — гэта іх асабістая справа. Што да курэння і алкаголю, то факт меншай працягласці жыцця ў мужчын гаворыць сам за сябе.

Не будзем скідваць з рахунку і стрэсы, наша няўменне і нежаданне вучыцца іх правільна пераадольваць. На долю Беларусі, безумоўна, выпала нямала выпрабаванняў, і яны не маглі прайсці бясследна для чалавека, але тым не менш... Нехта жыве доўга, таму што старэецца. Хоць абагульняць таксама не варта. Паглядзіце, як доўга жывуць у нас творчыя асобы, але нехта ж працуе на вытворчасці, шкоднай для фізічнага і псіхічнага здароўя. Відавочна, тут неабходны дыферэнцаваны падыход. Калі такой магчымасці няма, трэба гаварыць пра іншыя захады. Каб работнік, заняты на такой вытворчасці, мог, напрыклад, больш адпачываць — у шэрагу краін, дарэчы, зніжаецца працягласць працоўнага дня.

***— Калі, на ваш погляд, чалавек павінен пайсці на заслужаны адпачынак, перастаць працаваць?***

— Чалавек ніколі не павінен пераставаць працаваць! Як толькі мы перастаём нечым займацца, то хутка паглыбляемся ў дэпрэсію і наогул жывём менш. Выдатна, калі праца супадае з хобі. Тады наогул — якая пенсія? Калі цікавасць да занятку захоўваецца да старасці, мы такім чынам захоўваем свой інтэлект. Пастаяннае навучанне новаму істотна зніжае рызыку наступлення хваробы Альцгеймера. Вядома, што людзі, якія ў сталым узросце валодаюць некалькімі мовамі — трыма і болей, застрахаваныя ад гэтай паталогіі. Актыўная разумовая дзейнасць адназначна спрыяе актыўнаму даўгалеццю, захаванню разумовай функцыі. Калі ж мы працавалі на шкоднай вытворчасці, то, пэўна, трэба прадугледзець нейкі асобны варыянт. Галоўнае, каб у чалавека быў выбар і з надыходам нейкай узроставай мяжы ён не адчуваў дыскрымінацыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ■ Толькі разам

# Сухотам тут не месца

**Сёння, у Сусветны дзень барацьбы з туберкулёзам, Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае ўрады і грамадства «разам ліквідаваць» захворванне. Новая стратэгія барацьбы мае на мэце зніжэнне смяротнасці на 95 працэнтаў і зняншэнне колькасці новых выпадкаў на 90 працэнтаў цягам наступных дваццаці гадоў. Пры такім раскладзе ў 2035 годзе захваральнасць будзе на ўзроўні менш за 10 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва. У Беларусі пакуль 33 выпадкі на 100 тысяч, што значна менш, чым у эпідэмічныя 1990-я, але ўсё роўна мы далёка ад ідэалу.**

«Сёння ў краіне не выяўляецца, як раней, каля дзвюх тысяч новых захварэлых за год і ў тры разы менш памірае па прычыне захворвання», — адзначае **начальнік аддзела пярвічнай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла ЖЫЛЕВІЧ.**

Станоўчых зрухаў удалося дасягнуць дзякуючы ўкараненню з 2012 года рэвалюцыйных малекулярна-генетычных метадаў даследавання — гэта скарацілa час дыягностыкі з трох месяцаў да некалькіх дзён і нават гадзін. Цяпер такія тэхналогіі даступны ва ўсіх абласцях. Выкарыстоўваюцца міжнародныя стандарты лячэння як звычайнага, так і ўстойлівага да лекавых сродкаў туберкулёзу, так што ў апошнім выпадку 9 з 10 пацыентаў поўнасцю папраўляюцца. Хоць праблема яшчэ не вырашана цалкам: кожны трэці пацыент мае менавіта ўстойлівую да прэпаратаў форму захворвання. Па ўсёй краіне дзейнічае сістэма заахвочвання пацыента, які прыходзіць на кантраляванае лячэнне: ён атрымлівае праязны білет або прадуктовы набор. Разам з тым да канца гэтага года каля 150 пацыентаў будуць пераведзены на больш зручны для іх від амбулаторнага лячэння — ім не трэба будзе прыязджаць штодня ў медустанову.

Вялікая ўвага ў еўрапейскім рэгіёне надаецца цяпер уразлівым групам — гэта мігранты, пацыенты з алкагольнай і наркатычнай залежнасцю; тыя, хто знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі і ўжо вызвалены. Сапраўды, некаторыя катэгорыі насельніцтва маюць большую рызыку, аднак захварэць можа кожны. Так што пры з'яўленні кашлю, які не праходзіць даўжэй за два тыдні, неабходна звяртацца па медыцынскую дапамогу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■

ОАО «Белагропромбанк» сообщает о переформатировании сберегательной линейки с 01.04.2016. Приглашаем вкладчиков разместить денежные средства на новых условиях: в белорусских рублях до 30% годовых (по безотзывным вкладам) и до 24% годовых (по отзывным вкладам), в долларах США и евро до 5% (по безотзывным вкладам) и до 4% годовых (по отзывным вкладам), в российских рублях до 13% годовых. Подробная информация в подразделениях банка и на сайте.

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0» **с 01 апреля 2016 года**

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Сроки | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **до 6 месяцев** 90–180 дней | **от 6 месяцев до 1 года** 181–370 дней | **от 1 года до 2 лет** 371 – 740 дней | **от 2 до 5 лет** 741 – 2000 дней |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных до 17.06.2015 года*** | | | | |
| 1–10 000 000 | **28,0** | **29,0** | **30,0** | **30,3** |
| 10 000 001 – 50 000 000 | **28,1** | **29,1** | **30,1** | **30,4** |
| 50 000 001 и более | **28,2** | **29,2** | **30,2** | **30,5** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных с 17.06.2015 года до 01.04.2016*** | | | | |
| 1 – 10 000 000 | **24,0** | **24,3** | **24,5** | **24,8** |
| 10 000 001 – 50 000 000 | **24,1** | **24,4** | **24,6** | **24,9** |
| 50 000 001 и более | **24,2** | **24,5** | **24,7** | **25,0** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях**** | | | | |
| 1 – 10 000 000 | **0,5** | **0,5** | **0,5** | **0,5** |
| 10 000 001 – 50 000 000 | **0,5** | **0,5** | **0,5** | **0,5** |
| 50 000 001 и более | **0,5** | **0,5** | **0,5** | **0,5** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключенных до 25.11.2015*** | | | | |
| 1 – 500 | **3,5** | **4,0** | **5,1** | **5,5** |
| 501 – 5 000 | **3,7** | **4,5** | **5,3** | **5,5** |
| 5 001 и более | **3,9** | **5,0** | **5,5** | **5,5** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключенных с 25.11.2015 до 01.04.2016*** | | | | |
| 1 – 500 | **3,3** | **3,5** | **3,8** | **4,0** |
| 501 – 5 000 | **3,4** | **3,6** | **3,9** | **4,0** |
| 5 001 и более | **3,5** | **3,7** | **4,0** | **4,0** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0 в российских рублях, заключенных до 01.04.2016*** | | | | |
| 1 – 15 000 | **8,4** | **8,8** | **12,0** | **13,0** |
| 15 001 – 150 000 | **8,5** | **8,9** | **12,5** | **13,0** |
| 150 001 и более | **8,6** | **9,0** | **13,0** | **13,0** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США, евро и российских рублях**** | | | | |
| 1 – 15 000 | **0,1** | **0,1** | **0,1** | **0,1** |
| 15 001 – 150 000 | **0,1** | **0,1** | **0,1** | **0,1** |
| 150 001 и более | **0,1** | **0,1** | **0,1** | **0,1** |

Настоящие ставки применяются:
* для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.7 Условий договора срочного банковского вклада (депозита) Система сбережений Линия роста 2.0» (далее – Условия);
** для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в случаях автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.7 Условий.

25 лет белагропромбанк

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# АРЫЕНТАЦЫЯ НА ВЫНІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Калі вынік можна будзе ацаніць?***

— Гэта доўгі шлях, і трэба шмат чаго памяняць, каб рэформа пачала працаваць. Праз тры гады мы пабудуем інфармацыйную сістэму, якая дазволіць выстраіць такія ўзаемаадносіны паміж міністэрствамі фінансаў, гандлю, Камітэтам дзяржаўнага кантролю, Міністэрствам па падатках і зборах, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Статыстычным камітэтам, якія забяспечаць поўнае інфармаванне ўсіх атрымальнікаў і распарадчыкаў бюджэтных сродкаў аб справаздачнасці бюджэтных арганізацый. На падставе гэтай справаздачнасці будзе выбудоўвацца сістэма далейшых узаемаадносін паміж атрымальнікамі бюджэтных сродкаў, насельніцтвам і рэспубліканскімі органамі, аблвыканкамамі, райвыканкамамі — тымі, хто адказвае за якасць бюджэтных паслуг.

***— Якая работа будзе праведзеная сёлета?***

— Цяпер мы распрацоўваем стандарты фінансавай справаздачнасці, адаптуем міжнародныя стандарты для грамадскага сектара. Да канца года будзе распрацаваны высокаўзроўневы дызайн інфармацыйнай сістэмы, які ўключыць усе бізнес-працэсы, звязаныя з фарміраваннем, выкананнем і кантролем рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Асобны кампанент — распрацоўка бюджэту для грамадзян. Ён дазволіць інтэрактыўным чынам інфармаваць пра тое, як выконваюцца рэспубліканскі бюджэт, бюджэты рэгіёнаў, а таксама бюджэты атрымальнікаў бюджэтных сродкаў — школ, бальніц і г.д.

Задача нашага міністэрства — давесці да кожнага яснае разуменне таго, што за падаткі ён плаціць і на якія мэты гэтыя падаткі выкарыстоўваюцца.

***— Ці значыць гэта, што падаткаплацельшчык, які заплаціў дарожную пошліну, зможа даведацца, чаму на ўездзе ў яго двор ямы ў асфальце як былі, так і засталіся?***

— Людзі будуць ведаць адказы на пытанні, колькі ўсяго збіраецца ў краіне дзяржаўнай пошліны за доступ транспартнага сродку да дарожнага руху, на якіх прынцыпах гэтыя сродкі размяркоўваюцца і на якія аб'екты. Гэта інфармацыя ёсць і цяпер, але пакуль, на жаль, немагчыма зайсці на нейкі адзіны сайт і ўбачыць поўны спіс гэтых аб'ектаў.

## БОЛЬШ ІНФАРМАЦЫІ

***— Ад чаго будзе залежыць поспех рэформы?***

— Мы створым умовы, пры якіх бюджэтаванне, арыентаванае на вынік, пачне развівацца. Ад распарадчыка бюджэтнымі сродкамі, урада і парламента будзе залежыць, наколькі эфектыўна гэта сістэма запрацуе. Мы павінны арыентавацца на патрэбы тых, хто ажыццяўляе кантроль за выкарыстаннем бюджэтных сродкаў, рэалізуе мэты дзяржаўнай палітыкі. Міністэрства фінансаў будзе ў гэтым працэсе выканаўчым органам, які даводзіць інфармацыю ад аднаго ўдзельніка да другога, ад спажыўца паслугі да таго, хто прымае рашэнні, у тым ліку па размеркаванні бюджэтных сродкаў. Грошы павінны размяркоўвацца ў поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі нашых грамадзян. Калі трэба накіраваць на дарожнае будаўніцтва, то гэта будзе выказана.

Больш шырокі погляд на рэформу бюджэтнай сістэмы — поўная інфарматыўнасць кожнага ўдзельніка, пачынаючы ад грамадзян і заканчваючы парламентам: куды павінны выкарыстоўвацца грашовыя сродкі і якіх вынікаў, маючы на ўвазе тую ці іншую суму грошай, мы дабіваемся. Калі мы хочам вынікаў у ахове здароўя, значыць, павінны накіроўваць туды пэўную суму грошай. І кантраляваць: ці вырашаем мы, накіроўваючы туды грошы, пастаўленую задачу?

Гэта пачне працаваць праз некалькі гадоў, калі складзецца практыка, будзе выбудавана сістэма, калі атрымаем сігналы ад усіх удзельнікаў бюджэтнага працэсу, навучымся на гэтыя сігналы рэагаваць, перастроім свае адносіны да бюджэтных грошай: будзем глядзець, у першую чаргу, на іх агульную эфектыўнасць.

***— Ці азначае арыентацыя на вынік, што кіраўнік бюджэтнай арганізацыі будзе сам вырашаць, як яму распараджацца бюджэтнымі сродкамі?***

— Так. Цяпер мы даводзім да кіраўніка, колькі трэба прадугледзець грошай на заробак, які штат утрымліваць, колькі павінна быць лямпачак, крэслаў, сталоў... Калі новая сістэма запрацуе, кіраўнік будзе вырашаць усе гэта самастойна. Скажам, колькі яму трымаць штатных адзінак, каб адукаваць тысячу навучэнцаў, не парушыць працоўнага заканадаўства і максімальна скарачаць выдаткі. Колькі для гэтага патрэбна памяшканняў і як гэтыя памяшканні выкарыстоўваць. Павысіцца эфектыўнасць выкарыстання не толькі бюджэтных сродкаў, але і маёмасці. Кіраўнік будзе сам вырашаць, куды бюджэтныя грошы накіраваць у першую чаргу. Спатрэбіцца менш часу на рознага роду ўзгадненні, з'явіцца магчымасць эканоміць, а атрыманыя ў выніку эканоміі грошы накіроўваць на больш важныя напрамкі.

***— З кіраўніка запатрабуюць толькі колькасць выпускнікоў і якасць іх падрыхтоўкі?***

— Пад кожны кірунак выдаткаў сусветная практыка выпрацавала пэўны набор паказчыкаў. Асноўная праблема — знайсці правільныя крытэрыі ацэнкі, каб не памыліцца і зрабіць правільныя высновы.

Далей сістэма будзе развівацца яшчэ цікавей: мы пяройдзем да нарматыўнага фінансавання, калі будзем аплачваць, скажам, падрыхтоўку кожнага навучэнца. Мы цяпер з Міністэрствам адукацыі праводзім эксперымент, які набірае абароты: плацім грошы ў разліку на аднаго вучня. За дужкі выведзены расходы капітальнага характару, на якія пакуль кіраўнік уплываць не можа (камунальныя плацяжы), але яны таксама з часам трапяць у нарматыў. Больш вучняў — больш фінансавання. Гэта дае магчымасць яшчэ і канкурыраваць, і аптымізаваць расходы ў рамках раёна.

Кожны разумее, што калі нарматыў выдаткаў, скажам, 12 млн рублёў у год на аднаго вучня, то ў сельскай малакамплектнай школе выдаткі могуць дасягаць 50 млн на аднаго вучня. Калі забяспечыць падвоз дзяцей у буйную школу, павысіць яе камплектнасць, то эканомія стане дадатковай крыніцай расходаў на закупку абсталявання, аплату працы настаўнікаў. Тут узнікае пытанне больш якаснага кіравання сродкамі з боку тых, хто іх траціць, хто займаецца штодзённай дзейнасцю — у гэтым і ёсць эфект. І так у кожнай галіне: ахове здароўя, дарожнай гаспадарцы, культуры, СМІ...

## ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

***— Свабода, якую кіраўнікам бюджэтных арганізацый дасць пераход на выніковае бюджэтаванне, мае на ўвазе іх здольнасць да ініцыятывы. Як у нас з гэтым?***

— Зараз у бюджэтнай арганізацыі ініцыятыва абмежавана нормамі рэгулявання, і трэба прайсці доўгі шлях, каб сітуацыю змяніць. Наша задача — разняволенне дзелавой ініцыятывы з боку кіраўнікоў і работнікаў бюджэтнай арганізацыі. Мы з кіраўніка бюджэтнай арганізацыі павінны зрабіць яшчэ і гаспадарніка, фінансіста, чалавека, які будзе сачыць за кожным выдаткаваным рублём і будзе настроены на максімальную якасць паслуг, што аказваюцца.

***— І рыначніка?***

— Так, ён павінен арыентавацца на рынак, на спажыўца, на тыя патрэбы ў паслузе, якія мае насельніцтва. Калі насельніцтву патрэбна якасная адукацыя, значыць, яго задача — якасная адукацыя.

Спачатку трэба павысіць ступень даверу да кіраўніка бюджэтнай арганізацыі, потым даць яму неабходныя паўнамоцтвы самому распараджацца выдаткаваным аб'ёмам бюджэтных сродкаў. А патрабаваць — за канчатковы вынік, які мы павінны зразумець, якім чынам ацэньваць. Як ацэньваць якасць паслугі адукацыі? Як ацэньваць якасць паслугі аховы здароўя? У свеце існуе вельмі складаная, шматузроўневая сістэма ацэнкі якасці такіх паслуг. Яна выклікае давер. Гэта нашмат больш складана, чым кантраляваць запісы: «план» і «факт».

Глядзець, што запланавана ў каштарысе, і што выканана — самы просты кантроль, які ні да чога не абавязвае. Калі паглядзець на складанасць ацэнкі якасці паслуг аховы здароўя, скажам, у Вялікабрытаніі, то зразумела, што нікому не цікава, куды работнік медыцынскай установы патраціў грошы. Там кантралюецца вынік з боку насельніцтва, якое плаціць сваім рублём за гэту якасць, кантралюецца з боку прафесійнай супольнасці (паўторны кантроль), і трэці кантроль — з боку распарадчыка бюджэтных сродкаў, які ацэньвае, як усё гэта было арганізавана. Ад гэтай ацэнкі залежыць заробак канкрэтнага работніка, яго бюджэт. У нас гэтага няма, і такая перспектыва пакуль далёкая, але мы пачынаем рух у яе бок.

**Па заробках у бюджэтным сектары асноўны арыенцір — не дапусціць зніжэння ў рэальным выражэнні.**

Што тычыцца кіраўніка бюджэтнай арганізацыі — трэба стварацЬ кампетэнцыю. Мы будзем людзей навучаць, будзем даваць неабходныя інструментарый для аналізу сваіх выдаткаў, будзем даваць рэкамендацыі. Падрыхтуем спецыялістаў, якія будуць падказваць кіраўнікам; апошнія больш пранікнуцца пытаннямі фінансавай дысцыпліны, эканоміі бюджэтных сродкаў, будуць мець больш свабоды, будуць мець права выбару і права на памылку. Гэты этап трэба прайсці, выпрацаваць практыку, і праз 10 гадоў мы можам аказацца ў зусім іншай сістэме.

## НУЛЯВАЯ ЦЯРПІМАСЦЬ ДА КАРУПЦЫІ

***— Рэформа прадугледжвае антыкарупцыйныя механізмы?***

— Прадугледжвае. З аднаго боку, мы даём больш свабоды ў рэалізацыі паўнамоцтваў кіраўніка, у рэалізацыі яго асноўных задач, але з другога — ствараем інструментарый, які будзе мець нулявую цярпімасць да карупцыі і перашкаджаць любым праявам карупцыйнай дзейнасці. Асноўны канал, які патрабуе кантролю, — правядзенне працэдур дзяржаўных закупак на розных стадыях. Таму адным з элементаў рэформы бюджэтнага сектара з'яўляецца змена падыходаў да правядзення дзяржаўных закупак. Больш празрыстасці, больш інфарматыўнасці, стварэнне «гісторыі добрасумленнасці пастаўшчыкоў», каталогаў прадукцыі, індыкатыўных цэн і іншага, што дазволіць працаваць на гэтым полі празрыста і без рызыкі ўсім — кантралёрам, апаратарам, удзельнікам. У нас створаны электронныя пляцоўкі, створана сістэма, за якую адказвае Міністэрства гандлю сумесна з Міністэрствам эканомікі. Але гэтая сістэма, з аднаго боку, дастаткова складаная для бюджэтных арганізацый — стварае складанасці пры ажыццяўленні дзяржаўных закупак, павялічвае прамежак часу, які трэба выдаткаваць, каб правесці закупку, і ў рамках адна гадовага бюджэту, для таго, каб закупку рэалізаваць, трэба ўвесь час спяшацца і на нешта закрываць вочы. У канчатковым выніку гэта не прыводзіць да эканоміі бюджэтных сродкаў. Акрамя таго, у існуючай сістэме захоўваюцца магчымасці, якія могуць з'яўляцца каналам для карупцыйных праяў. Іх трэба выключыць.

Задача няпростая, але мы не будзем руйнаваць сістэму, якая існуе, мы ўдасканалім яе.

## ЗАХАВАЦЬ БАЛАНС

***— Якія праблемы з бюджэтам існуюць сёння?***

— У залежнасці ад магчымасці экспарту нашых тавараў мы рабілі розныя сцэнарыі фарміравання даходнай часткі бюджэту. Даходная, па нашых ацэнках, будзе фарміравацца ніжэйшай, чым мы прагназавалі. Усё залежыць ад таго, наколькі будзе мяняцца эканоміка нашых гандлёвых партнёраў (бо мы — адкрытая краіна, экспарцёр тавараў) і наколькі попыт з боку нашых гандлёвых партнёраў будзе плацежаздольны. Задаволіць яго сваёй вытворчасцю мы можам, а аплаціць яго нашы партнёры, на жаль, гатовы ў меншай ступені, чым раней.

Мы бачым, што ёсць праблемы з атрыманнем даходаў, адпаведна, гэта патрабуе аптымізацыі бюджэтных расходаў. Мы цяпер такую аптымізацыю пачалі праводзіць: зарэзервавалі пэўныя віды расходаў, у выніку першыя два месяцы працуем з прафіцытам; забяспечылі той узровень, які павінны былі забяспечыць па рэспубліканскім бюджэце, калі б умовы адпавядалі прагнозу.

Такім чынам, з-за таго, што менш атрымалі даходаў, мы прафінансавалі менш расходаў, але прафіцыт застаўся планавы. Гэта значыць, што мы пакуль ідзём у кірунку, які адпавядае Закону «Аб рэспубліканскім бюджэце». Сыходзячы з гэтай палітыкі, выконваюцца і мясцовыя бюджэты.

Вядома, гэта запатрабуе рашэнняў па абмежаванні не толькі капітальных выдаткаў бюджэтных арганізацый, але і бягучых. У тым ліку будзем абмяжоўваць і рост заробкаў. Па заробках у бюджэтным сектары асноўны арыенцір — не дапусціць зніжэння ў рэальным выражэнні. У цэлым рост фонду аплаты працы будзе адпавядаць узроўню інфляцыі, але той інфляцыі, якую мы вызначылі для сябе як задачу на 2016 год. Таму заробак не будзе расці, але, напэўна, і не ўпадзе.

***— Калі дзяржаўны бюджэт можа быць удакладнены?***

— Зараз рызыкі невыканання бюджэту няма. Мы жорстка абмежавалі расходы, і нарастання дэфіцыту бюджэту, які пагражае фінансавай збалансаванасці краіны ў цэлым, не адбываецца. Мы выканалі бюджэт за два месяцы і будзем яго выконваць далей, паралельна рыхтуючы палажэнні пра скарачэнні расходаў і ўдакладненні даходаў. Будзем шукаць пазабюджэтныя непадатковыя даходы, рэалізоўваць комплекс мер, звязаных з прыцягненнем у эканамічны абарот нявыкарыстанай маёмасці і іншае. Мы прымем цэлы набор захадаў, ад выніковасці якіх стане зразумела, якія расходы рэальна фінансаваць да канца года, а ад якіх прыйдзецца адмовіцца.

Гэта працэс дастаткова творчы, ён патрабуе часу, ацэнкі эканамічнай сітуацыі. Не спяшаючыся, але ў пастаяннай рабоце мы падрыхтуем праект указа па ўдакладненні бюджэту і ўнясём яго ў вызначаным парадку на разгляд парламента і Прэзідэнта.

***— Наколькі шкодным для бюджэтных арганізацый можа аказацца рэжым зацягвання паясоў?***

— Рызыкі ёсць, мы іх разумеем. У нас вельмі развітая інфраструктура: шмат аб'ектаў нерухомасці, якія належаць дзяржаве, таму, безумоўна, адмова ад капітальных рамонтаў, будаўніцтва, рэканструкцый, мадэрнізацыі гэтай інфраструктуры будзе прыводзіць да яе пагаршэння. Каб гэтага пазбегнуць, неабходна рэформа не кіравання дзяржаўным бюджэтам, а структуры бюджэту. Трэба змяняць структуру расходаў. Максімальна адыходзіць ад падтрымкі эканомікі, субсідавання рознага роду паслуг для грамадзян, для прадпрыемстваў, і за кошт скарачэння субсідый нарошчваць капітальныя ўкладанні, інвестыцыі ў бюджэтную інфраструктуру. Гэта вызначаецца не жаданнем Міністэрства фінансаў, не жаданнем урада, але эканамічнымі магчымасцямі.

Па меры стабілізацыі інфляцыі, зніжэння працэнтных ставак па крэдытах, росту прапановы грошай унутры эканомікі, скарачэння выдаткаў прадпрыемстваў (гэта таксама ключавы момант), мы атрымаем комплексны эканамічны эфект, і тады настолькі маштабная падтрымка прадпрыемстваў з бюджэту не спатрэбіцца. У выніку вырасце даходная частка бюджэту, бо ўзрасце падаткавы патэнцыял прадпрыемстваў, павысіцца іх прыбытковасць, эфектыўнасць, узрасце экспарт.

У сувязі са скарачэннем субсідавання вызваліцца парадку 10% аб'ёму бюджэтных расходаў. Тады мы зможам істотна нарасціць аб'ём капітальных укладанняў і давесці яго да ўзроўню, які мелі 10 гадоў таму — парадку 7% ВУП. Зараз — 4-5%, сёлета будзе 3-3,5%. Гэта не ніжэй за краіны-суседзі, але для такой развітай інфраструктуры, якая ў нас ёсць, недастаткова. Тым больш што і нявырашаных праблем засталося шмат. Мы моцна рванулі ў жыллёвым будаўніцтве, і цяпер трэба падцягваць сацыяльную інфраструктуру — трэба будаваць школы, дзіцячыя садкі, дарогі, масты, паляпшаць транспартныя зносіны. Шмат чаго трэба рабіць. А для таго, каб гэта рабіць, трэба, каб эканоміка працавала самастойна, бюджэт істотна знізіў падтрымку гэтай эканомікі і накіраваў грошы на інфраструктуру.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«КУПИ SHAMTU И ВЫИГРАЙ КАНИКУЛЫ В СОЧИ!»**

Наименование организатора: **Издательско-производственное частное унитарное предприятие «Проспектпресс».**

Место нахождения организатора: **220050, г. Минск. ул. Интернациональная, д. 16.**

Наименование рекламной игры: **«Купи Shamtu и выиграй каникулы в Сочи!»**

Территория проведения рекламной игры: **Республика Беларусь.**

Срок начала рекламной игры: **16 ноября 2015 года.**

Срок окончания рекламной игры: **11 апреля 2016 года.**

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: **свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2664 от «13» ноября 2015 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь.**

Количество участников рекламной игры: **699 участников.**

Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда: призовой фонд разыгран полностью.

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1. | Веракса Оксана Владимировна | Мультиварка Panasonic |
| 2. | Дегилевич Любовь Александровна | Набор из 6 шампуней |
| 3. | Романовская Юлия Викторовна | Набор из 6 шампуней |
| 4. | Шпак Леонид Алексеевич | Мультиварка Panasonic |
| 5. | Василёнок Наталья Владимировна | Набор из 6 шампуней |
| 6. | Коробова Янина Николаевна | Набор из 6 шампуней |
| 7. | Бортник Игорь Николаевич | Мультиварка Panasonic |
| 8. | Янковский Дмитрий Иванович | Набор из 6 шампуней |
| 9. | Киселёва Ольга Иосифовна | Набор из 6 шампуней |
| 10. | Мартинкевич Доминик Витальевич | Мультиварка Panasonic |
| 11. | Федутик Лариса Ивановна | Набор из 6 шампуней |
| 12. | Шпак Анна Алексеевна | Набор из 6 шампуней |
| 13. | Дубенок Екатерина Павловна | Мультиварка Panasonic |
| 14. | Ястреб Надежда Святославовна | Набор из 6 шампуней |
| 15. | Ширковец Татьяна Никодимовна | Набор из 6 шампуней |
| 16. | Линник Ольга Ивановна | Мультиварка Panasonic |
| 17. | Фро Андрей Владимирович | Набор из 6 шампуней |
| 18. | Павлють Татьяна Степановна | Набор из 6 шампуней |
| 19. | Перепечина Инна Михайловна | Мультиварка Panasonic |
| 20. | Марук Наталья Николаевна | Набор из 6 шампуней |
| 21. | Суббот Кристина Петровна | Набор из 6 шампуней |
| 22. | Дроздовская Марина Викторовна | Мультиварка Panasonic |
| 23. | Суббот Александр Иванович | Набор из 6 шампуней |
| 24. | Поликарпова Елена Михайловна | Набор из 6 шампуней |
| 25. | Супранёнок Светлана Петровна | Туристическая путевка в г. Сочи на 5 (пять) человек |

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 29 608 19 49 (в рабочие дни с 9.00 до 18.00).

УНП 101520868

Сямейная газета
Выпуск № 6 (49)



# ЗОЛАТА ЭЛЬФАЎ

У нашай сям'і — прыбаўленне. Рудавалосую ляльку (я яе назвала Паліянай) пашыла для мяне маці маёй сяброўкі. Вось ужо больш як тры тыдні Паліяна жыве на маёй паліцы, сярод кніг, якраз насупраць ложка. Яна — першая, каго я бачу, калі зранку расплюшчваю вочы. Пасяліла яе туды наўмысна, каб часцей успамінаць, што «проста дыхаць — гэта яшчэ не значыць жыць».

Гэта фраза з майго любімага эпізоду з казачнай гісторыі пра Паліяну. Памятаеце, як строгая цётачка Полі выхоўвала сваю пляменніцу: «З гэтага часу кожную раніцу з дзевяці да паловы дзясятай вы будзеце чытаць мне ўслых. Час, які ёсць у вас да гэтага, вы павінны выкарыстаць на тое, каб прыбрацца ў сваім пакоі. Па серадах і суботах, скончыўшы чытанне, будзеце праводзіць ранішнія гадзіны на кухні, дзе Нэнсі будзе вучыць вас гатаваць. Ва ўсе іншыя дні будзеце бавіць іх са мной, навучаючыся шыццю...» «Ах, цёця Полі, баюся, што вы забыліся мне вылучыць час на тое, каб... на тое, каб проста жыць! — з жахам усклікнула Паліяна. — «Вы ж і так будзеце жыць падчас вашых заняткаў!» — «Зразумела, што я падчас гэтых заняткаў буду дыхаць. Але, цёця Полі, справа ў тым, што дыхаць — гэта яшчэ зусім не значыць жыць! Бо людзі дыхаюць і калі спяць, але хіба ж яны тады жывуць?!»

Як вы думаеце, пра што шкадуюць людзі, якім засталося жыць месяц-два? Медсёстры хоспіса кажуць, што практычна ўсе пацыенты-мужчыны шкадавалі, што вельмі шмат сіл аддавалі працы. Пры гэтым удзялялі мала часу сваім бацькам, дзецям, жонцы. Азіраючыся назад, яны не разумелі, навошта так шмат працавалі і чаго хацелі гэтым дасягнуць. Самым жа распаўсюджаным шкадаваннем пацыентаў хоспіса было: «Мне не хапіла смеласці жыць так, як хацелася, а не так, як чакалі ад мяне іншыя людзі». Былі і іншыя шкадаванні, але, заўважце, ніхто не згадаў грошы, пра якія апошнім часам усе толькі і размаўляюць. Тэма заробкаў і курсаў валюты сёння стала больш папулярнай, чым тэма надвор'я. Нават у паліклініцы доктарка, якую я бачыла ўпершыню, перш чым спытаць, на што я скарджуся, пацікавілася (даведаўшыся, дзе я працую): «Ці шмат сёння зарабляюць журналісты?»

...У дзяцінстве я любіла розныя казачныя гісторыі пра эльфаў. Адну з іх распавёў у сваёй аўтарскай радыёперадачы Барыс Грабеншчыкоў. Пра тое, як чалавек трапляе ў чароўны свет эльфаў. Збіраючыся вярнуцца дадому, ён цішком набірае поўныя кішэні тамтэйшага золата і брыльянтаў. Апынуўшыся ў сваім звыклым свеце, хціва правярае, ці цэлыя скарбы. І да свайго жаху і расчаравання раптам заўважае, што замест золата яго кішэні поўныя сухіх восеньскіх лісцяў, а замест брыльянтаў у далонях кропелькі расы. І герой казкі кажа: «Мяне падманулі». Але гэта не так. Проста знаходзячыся ў чароўным свеце і іншым стане, ён бачыў усё па-іншаму. Бо ў эльфаў іншае паняцце пра тое, што каштоўнае. Там каштоўнасцямі лічацца не грошы, а шчасце бачыць усход сонца. Там лес каштоўнейшы за тыя грошы, якія можна зарабіць, ссекшы яго. А сад важнейшы, чым дарагі бізнес-цэнтр, які можна пабудаваць на яго месцы. Не, не падумайце, я не бачу ў рознакаляровых паперках нічога дрэннага. Дрэнна становіцца, калі мы пачынаем лічыць, што грошы маюць самастойную каштоўнасць. І хвалюючыся толькі пра іх, забываемся на само жыццё. І тады, гледзячы на кроплю расы ў далоні, мы лічым, што нас падманулі.

У мяне скончыўся чарговы працоўны нататнік. Заводжу новы і па звычцы, першым чынам, пераношу на першую старонку адну з любімых цытат «Зарабляючы грошы на жыццё, не забудзьцеся на само жыццё». Каб часцей успамінаць, што сапраўдная каштоўнасць — гэта ўменне бачыць, што восеньскае лісце каштоўнейшае за золата, а кропля расы зззяе ярчэй, чым усе брыльянты свету.

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■ Тыя, хто побач

# ЛЮБОЎ — ГЭТА ДЗЕЯСЛОЎ

## Яна праяўляецца ў штодзённых учынках

**Таццяна і Ілья СІЛЬЧУКОВЫ — творчая пара оперных спевакоў. Сёння яны абодва працуюць у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі. Ілья — саліст тэатра, Таццяна — памочнік рэжысёра. Да Ільі, які выступае не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой, папулярнасць прыходзіла двойчы. Прафесійная — пасля перамогі ў міжнародным конкурсе вакалістаў імя М. Магамаева сем гадоў таму, народная — пасля пераможнага трэцяга месца ў фінале праекта «Вялікая опера» расійскага тэлеканала «Культура» ў 2014-м. Але ці магчыма было б гэта без надзейнага тылу, што цалкам забяспечвае Таццяна, якая паспявае і працаваць, і займацца домам?.. Цяпер у сужэнцаў двое дзяцей — амаль трохгадовая Алівія і васьмігадовы Лука. На інтэрв'ю для «СГ» яны прыйшлі ўчацвярых. І пакуль дзеці смакавалі салодкае, бацькі разважалі пра тое, як варта выхоўваць малых і ці могуць дзве творчыя асобы скласці надзейны сямейны саюз.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Працяг тэмы

# ПРЫШЧЭПКА ДЛЯ ЧЫТАННЯ

## Чаго і чаму не хапае дзіцячым выданням

**Памятаеце часы, калі набыць кнігу можна было толькі здаўшы 20 кілаграмаў макулатуры? А права прыдбаць поўныя зборы твораў класікаў — выйграць у кніжную латарэю? Не забыліся, як хаваліся ноччу пад коўдру з ліхтарыкам, каб дачытаць любімую казку? Такія або амаль такія аматары кніг ёсць і цяпер, але сустракаюцца яны значна радзей. Што патрэбна сучасным чытачам, асабліва самай складанай, непрадказальнай і шчырай катэгорыі — дзецям? Як пісаць, каб было цікава і карысна, каб «чапляла» і вымушала думаць? Чаму наогул жаданне чытаць лічыцца адным з неабходных крытэрыяў культурнага выхавання? Адказ на гэтыя і іншыя пытанні спрабавалі знайсці беларускія і расійскія пісьменнікі і бібліятэкары — удзельнікі «круглага стала», што прайшоў у Выдавецкім доме «Звязда».**

*(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Гэтыя дрэвы Алена бачыла з акна інтэрната.

# БЫЛІНКА НА ВЕТРЫ

## ВЫПУСКНІЦА ШКОЛЫ-ІНТЭРНАТА РАСКАЗАЛА ПРА СВАЁ ДЗЯЦІНСТВА І ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ З 15 ГАДОЎ




Асабістая справа — некалькі старонак напаміну пра дзяцінства.



Сямейныя клопаты, утульная кватэра і родныя побач — складнікі шчаслівага дарослага жыцця.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Алену забралі ад маці, калі ёй не было яшчэ і трох. Пасля выхаду з інтэрната ў свой 15-ы дзень нараджэння яна была настолькі непрыстасаванай да жыцця, што спрабавала есці сырыя макароны — проста не ўяўляла, што іх трэба варыць. Пасля вучылася гатаваць па кнігах, а элементарныя бытавыя веды атрымоўвала з размоў з бібліятэкарам. Цяпер яна замужняя жанчына, уладальніца дзвюх кватэр і маці дзвюх дачок.**

## Абараняла дачку і трапіла... за краты

Першы дзень у дзіцячым доме запомніўся на ўсё жыццё.

— Да мяне падышла дзяўчынка Іра і сказала: «Давай будзем плакаць — прыкінемся, быццам нас ужо пакаралі». Я нічога не зразумела, але пачала плакаць, — успамінае Алена. — Потым падышла выхавальніца і пытаецца: «Чаго равеш? Новенькіх у нас не караюць». Аказалася, у групе, куды я трапіла, калі хтосьці правініўся, білі па мяккім месцы. Мы потым з гэтай Ірынай былі найлепшымі сяброўкамі, аднак пасля выхаду з інтэрната яна спілася, бо вярнулася ў кватэру да бацькоў, ад якіх яе калісьці і забралі. Кажуць, нават і ў турме ўжо пабывала...

Скончыўшы інтэрнат, Алена высветліла, што яе маці трапіла за краты праз учынак, які цяпер бы расцанілі як хуліганства і далі б штраф. Яна гуляла ў мяч з маленькай Аленай на тэрыторыі садка, куды і вадзіла малую. Вартаўнік пачаў іх выганяць і штурхануў дзіця так, што дзяўчынка паляцела на зямлю. Вядома, маці кінулася на абарону і збіла дзядзьку. На лямант з садка выйшла яго жонка і таксама трапіла пад гарачую руку раз'юшанай жанчыны.

> **Матулін знаёмы Герман часам наведваў мяне ў дзіцячым доме, вазіў фатаграфавацца і здымкі дасылаў маці. Нават да сваіх родных у Казань вазіў. Пакуль туды ехалі, мяне на вакзале цыганы ўкралі. Добра, што хутка знайшлі...**

— Наступны раз яе пасадзілі за крадзеж дзяржмаёмасці ў турму ўжо не ў Мінску, — працягвае Алена. — Трэці тэрмін яна атрымала, нават не даехаўшы да сталіцы пасля другога — украла недзе вазу і спрабавала прадаць, каб даехаць дахаты.

Пакуль Алена жыла ў інтэрнаце, маці спачатку наведвала яе. Апошні раз перад доўгім расстаннем яны бачыліся, калі маёй суразмоўцы было 4-5 гадоў, потым толькі перапісваліся.

— Праз лісты мама дыстанцыйна займалася са мной правапісам. Дасылала мне разам са сваім лістом мой з выпраўленымі памылкамі. Выпісвала праверачныя словы і правілы. Калі я скончыла інтэрнат і перад канчатковым выхадам з яго сцен адпачывала ў летніку, гэтыя лісты згубіліся. Я так плакала, што аж тэмпература ўзнялася, бо гэта быў адзіны напамін пра маму.

Наступны раз Алена ўбачылася з маці, калі заканчвала вучылішча. Паехала да яе на Поўнач, дзе жанчына засталася пасля вольнага пасялення. Пры сустрэчы з абодвух бакоў было толькі сухое «Прывітанне», аднак прыезд дачкі падштурхнуў жанчыну вярнуцца назад у Беларусь, куды не... даўно клікала сяброўка.

— Пэўны час мы яшчэ сустракаліся, і першую ўнучку яна заспела, аднак цёплых адносін не атрымалася. Я пахавала яе, аднак на магілу ў Віцебскую вобласць пасля гэтага (больш за 10 гадоў ужо) не ездзіла.

## «Цяжарнасць» як у індыйскім кіно

Жыццё ў клетцы — так характарызуе сваё «інтэрнатаўскае» дзяцінства Алена. Яна ўспамінае, што дзеці, якіх сваякі не забіралі на выхадныя, жылі, не ведаючы, што за свет за плотам інтэрната.

— Я выходзіла з гэтай «клеткі» толькі на трэніроўкі. Займалася лёгкай атлетыкай — сямібор'ем. На спаборніцтвы ездзілі ў іншыя гарады. Але ніхто нават не цікавіўся, якое месца заняла. Шкадую, што кінула спорт. Але ж «добрыя» выхавальнікі мне сказалі: «Навошта табе гэта — усё роўна за мяжу ніхто цябе не пусціць, бо маці судзімая». А побач не было нікога, хто б падказаў, як зрабіць.

У інтэрнаце не было нават тэлевізара. Інфармацыю пра свет атрымлівалі ад тых, хто ездзіў да блізкіх. Часам дзяцей вадзілі на індыйскія фільмы, каханне ў якіх паказвалі вельмі цнатліва: сціплы пацалунак, а наступны кадр — жанчына ўжо з немаўлём. Алена вырашыла, што так усё і адбываецца, і калі мімалётам хтосьці з хлопцаў цмокнуў яе ў шчаку, з дзяўчынай здарылася істэрыка: баялася, што зацяжарала. Ледзьве супакоілі.

> **«Усё маё жыццё мне гатавалі, мяне апраналі, я проста не ведала, як і што робіцца, адкуль што бярэцца. Катастрафічна не хапала ведаў пра свет».**

Шчаслівымі лічыліся дзеці, якія мелі хатняе адзенне. На ўсёй казённай вопратцы паўсюдна былі штампы, прычым у любым месцы.

— На выпускны ў нас ва ўсіх былі аднолькавыя сукенкі, а ў некаторых проста на грудзях ці падоле стаяла пячатка школы-інтэрната, а ў каго і некалькі.

## Два рублі на дыскатэкі

Школа-інтэрнат, дзе вырасла Алена, была васьмігодкай. Пасля яе дзеці маглі ісці або ў вучылішча, дзе ёсць інтэрнат (бо інакш няма дзе жыць), або адразу працаваць. У вучылішча ад мясакамбіната, куды дакументы падала сяброўка, дзяўчына прыйшла з паліто і тым, што на ёй было. Падчас вучобы сірот карміў бясплатна ў сталоўцы ад вучылішча. Выдавалі ім коўдру, падушку і бялізну, якую мылі таксама за дзяржаўны кошт. Такі падыход таксама не спрыяў развіццю самастойнасці.

— Усё маё жыццё мне гатавалі, мяне апраналі, я проста не ведала, як і што робіцца, адкуль што бярэцца. Катастрафічна не хапала ведаў пра свет. Дзякуй бібліятэкару з вучылішча, якая часта размаўляла са мной і давала карысныя кнігі.

Раз на год выпускнікі інтэрнатаў маглі па адпаведнай паперы выбраць у краме адзенне на пэўную суму. У першы такі паход Алена набыла спадніцу з кофтай, белыя туфлі, нешта з бялізны і куртку, якая была на некалькі памераў большай, чым трэба.

Атрымаўшы першую стыпендыю, дзяўчына была ў шоку, бо ніколі не мела грошай на руках. Яна пакінула два рублі на месяц дыскатэк у Беларускім таварыстве глухіх, куды хадзіла яшчэ ў інтэрнаце, а астатняе «спусціла» на смачнае.

— Дагэтуль я толькі пару разоў бачыла грошы. Мама дасылала, і мы разам з выхавальніцай на пошце іх атрымоўвалі. Аднойчы, памятаю, шмат прыйшло. Я купіла сабе спадніцу, цукерак, а куды зніклі астатнія — нават і не памятаю.

## Змаганне за кватэру

Першы час пасля вучылішча Алена жыла ў сям'і знаёмай, з якой вучылася.

— Калі б не яна, я, пэўна б, ужо даўно стала бамжом, — мяркуе жанчына. — Я першы раз тады ўбачыла, як гатуюць, даведалася, адкуль ежа бярэцца. Глядзела ва ўсе вочы, як яе маці каля пліты завіхаецца. Потым вучылася гатаваць па кнігах. Асабліва карысным сталася выданне «Мужчына на кухні». У ім якраз для інтэрнатаўскіх апісаны працэс: налі вады, усып крупы, вары.

Пасля яна ўжо і тарты навучылася пячы, і закаткі ставіць.

> **Першы хатні Новы год з падарункамі і ласункамі я ўбачыла ў сёмым класе. Мяне ўзялі з сабой да цёткі аднагрупніцы Люда і Света, бо я адна заставалася на свята ў інтэрнаце. Я не ўяўляла, што на стале можа быць столькі страў.**

Пакуль дабівалася ўласнага жылля, што павінна было выдзяляцца сіротам, чытала шмат юрыдычнай і іншай літаратуры.

Спачатку спрабавала стаць на чаргу на атрыманне жылля ад трактарнага завода, таму што дом, дзе Алена некалі жыла з мамай, належаў прадпрыемству. Там яе «адфутболілі». Тады яна пайшла ў гарвыканкам і сказала, што будзе жыць у іх, бо больш няма дзе. Урэшце ёй далі пашыканне ў 4-пакаёвай кватэры. Алена ўладкавалася на працу вадзіцелем трамвая, нарадзіла першую дачку.

— У нашай камуналцы ў двух пакоях жылі бабуля з дзедам, я ў трэцім, у чацвёртым — маладая сям'я з дзіцем. Як толькі маладыя з'ехалі, я напісала заяву, каб за мной замацавалі іх пакой, бо стаяла ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Потым на маіх вачах у п'янай бойцы забілі дзеда. А ў хуткім часе і бабулі не стала.

Алена падала паперы, каб за ёй замацавалі і астатнія пакоі. Пачаліся доўгія суды — аддаваць 4-пакаёўку сіраце ніхто не хацеў... Але нарэшце жанчына выйграла і стала ўладальніцай усёй кватэры. Пасля яе размяняла на дзве.

З бацькам першай дачкі яны ажаніліся, калі Аліне было сем месяцаў.

— Пры гэтым развяліся мы ледзьве не праз месяц, бо мой абраннік аказаўся не гатовым да дарослага жыцця і адказнасці, — уздыхае Алена...

Пакуль жанчына была ў дэкрэце, здарылася, што аднойчы грошы скончыліся і ёй проста не было чаго есці. Дапамога прыйшла ў выглядзе скрыні макаронаў, якую ёй прэзентавала жаніх лепшай сяброўкі — Іры Багданавай. Алена ўпэўнена, што тыя макароны выратавалі ёй жыццё і дагэтуль абавязкова падымае бакал за Аляксея, калі ён прысутнічае за сталом, якое ні было б свята.

Свайму другому мужу яна зрабіла прапанову сама. Нарадзіла другую дачку Вераніку. Год назад упершыню стала бабуляй...

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Чалавек — чалавеку

# АПОШНЯЯ ЭЛЕКТРЫЧКА



## Часам трэба праспаць свой прыпынак, каб зноў паверыць у дабрыню

**Стаміўшыся пасля цяжкага дванаццацігадзіннага працоўнага дня, дваццацігадовая Алеся марыла толькі пра здаровы сон. Здала грошы інкасатарам, зачыніла абменны пункт, і пабегла на вакзал. Яна была ўпэўненая, што электрычка, якая адпраўлялася а 22:16 з прыпынку «Мінск-Пасажырскі» і ішла да Маладзечна, уцячэ з-пад яе носа. Але Алесі пашанцавала: да адпраўлення цягніка заставалася адна хвіліна. Дзяўчына ўскочыла ў апошні вагон, заплюшчыла вочы і... заснула. Прачнулася ўжо тады, калі родны запаветны прыпынак «Радашковічы» аказаўся далёка за межамі дасяжнасці...**

Цяжка ўявіць, чым магла скончыцца гэтая гісторыя, калі б усё атрымалася зусім не так, як у той позні вечар. «Калі зразумела, што праехала патрэбны прыпынак, вельмі разгубілася, — прызналася Алеся. — Я падсела да прыемнай пажылой пары і спытала, у колькі наступная электрычка ў бок Мінска. Аказалася, што толькі а чацвёртай гадзіне ночы! У Маладзечна, дзе я нікога не ведаю, ехаць у такі час не адважылася. Заставаўся толькі адзін варыянт — выклікаць таксі, аднак мае новыя знаёмыя бурна запратэставалі. Яны прапанавалі сваю дапамогу, але папярэдзілі, што ў іх «усё па-простаму».

Людміла Аляксееўна і Валерый Аляксандравіч аказаліся чулымі людзьмі з залатым сэрцам. Яны накармілі, абагрэлі і спаць паклалі стомленую дзяўчыну. Зразумела, Алеся не забылася на цёплы прыём гаспадароў, таму праз некаторы час яна вырашыла наведаць іх і аддзячыць за прытулак. Разам з дзяўчынай у Аляхновічы выправілася і карэспандэнт нашай газеты.

Да аграгарадка, што ў Маладзечанскім раёне, дабіраліся на электрычцы каля гадзіны. Хата нашых гаспадароў размяшчалася недалёка ад чыгуначнага прыпынку. Лорд (такая мянушка была ў нямецкай аўчаркі незвычайных памераў) адразу кінуўся насустрач Алесі і пачаў жвава церціся аб ногі. Напэўна, пазнаў колішнюю знаёмую. Потым да Лорда далучылася чарнявая Марця. Гаспадар сустрэў нас на падворку і ветліва запрасіў у хату.

Калі мы ўвайшлі, гаспадыня завіхалася на кухні. Прыемная ўсмешка асвятліла жаночы твар, калі яна ўбачыла Алесю. Людміла Аляксееўна апранула нас у цёплыя шарсцяныя кофты і паклікала вячэраць. Жанчына рассцілала абрус са словамі: «Гэта наш каронны абрус. За ім мы збіраемся і ўсёй сям'ёй, і з выпускніцамі са школы, у якой я працую бібліятэкарам».

Адразу кінуліся ў вочы прыязныя стасункі паміж мужам і жонкай. «Я не ведаю, ці можна есці сённяшнюю вячэру», — пажартавала Людміла Аляксееўна, на што Валерый Аляксандравіч адказаў: «У мяне ежа атрымліваецца заўсёды смачная». Спрэчка скончылася словамі: «Валера, ты ў сабе надта ўпэўнены». Такая гулліва-прыемная атмасфера захавалася на працягу ўсёй сустрэчы. А вячэра, сапраўды, атрымалася на славу.

Карэнныя мінчукі Людміла і Валерый пасяліліся ў Аляхновічах паўгода таму. «Вырашылі перабрацца далей ад горада, таму што ўскладнілася сітуацыя з сабакамі: падаткі трэба выплачваць. Тым больш, куды ім наморднікі — яны ж пакрыўдзяцца! — тлумачаць гаспадары. — Ды і з узростам з'яўляюцца новыя каштоўнасці: пацягнула ў вёску, да зямлі, да прыроды. Гэтая хатка для нас — як бальзам на душу. Тут і нам добра, і Марці з Лордам — раздолле».

**«Не дзіва, што мы дапамаглі Алесі. У мяне дачка яе ўзросту вучыцца ў Расіі. Спадзяюся, што калі з ёй што-небудзь здарыцца, то там знойдуцца добрыя людзі».**

А Людміла Аляксееўна прызнаецца, што ў яе ніколі нікога не было ў вёсцы: «Нават дачы не было. Я печку бачыла толькі на малюнках. Ніколі не палола. Насамрэч, цяжка было звыкнуцца з побытавымі ўмовамі. Валера кажа, што маё месца пад душам, а тут яго няма. Але з цягам часу прызвычаіліся».

«Пазнаёміліся з Валерам у мяне дома падчас сяброўскай сустрэчы, — працягвае гаспадыня. — Ніхто з мужчын не прыкмеціў, што шафа стаяла зусім крыва. Карацей кажучы, наступным разам ён прыйшоў з прыладамі». Раней Валерый Аляксандравіч працаваў у ваеннай прамысловасці, а калі выйшаў на пенсію працягнуў працаваць у ахове. Людміла Аляксееўна, у сваю чаргу, марыла пра юрыспрудэнцыю, скончыла медвучылішча, потым універсітэт і ў выніку стала бібліятэкарам.

Дзеці Людмілы і Валерыя даўно выраслі і раз'ехаліся, толькі жывёлы ўратоўваюць ад адзіноты. Людміла Аляксееўна аддалася ўспамінам: «Не дзіва, што мы дапамаглі Алесі. У мяне дачка яе ўзросту вучыцца ў Расіі. Спадзяюся, што калі з ёй што-небудзь здарыцца, то там знойдуцца добрыя людзі. Калі Машачка жыла з намі, у кватэры пастаянна гучаў смех. Цяпер мы радыя любым гасцям».

Надвячоркам вырашылі прайсціся па Аляхновічах. Гаспадыня прызналася, што выгульвае сабак паасобку, у адрозненне ад мужа. Марця па сваёй існасці — паляўнічы сабака, а Лорд — ахоўнік. Чамусьці ніхто не здзівіўся з-за таго, што Лорд увесь час круціўся каля Алесі. Іх нават любоўнай парачкай празвалі.

На чыгуначнай платформе, калі прыйшоў час развітвацца, Людміла Аляксееўна расчулілася: «Я цябе часта ўспаміналa, Алеся, чакала, што патэлефануеш або прыедзеш. Дзяўчаты, вы зрабілі нам свята. Дзякуй вам за гэтае свята, за душэўнасць, за цеплыню. Абавязкова прыязджайце вясной, вогнішча развядзём».

Калі махалі рукамі на развітанне, чулася жаласлівае скавытанне Лорда, а да вушэй даносіліся словы: «Валера, я цяпер часцяком буду ездзіць на апошняй электрычцы, раптам хто-небудзь праспіць».

**Калі дзяўчына зразумела, што праехала патрэбны прыпынак, вельмі разгубілася. Падсела да прыемнай пажылой пары і спытала, у колькі наступная электрычка ў бок Мінска. Аказалася, што толькі а чацвёртай гадзіне ночы!**

Сустракацца з такімі шчырымі людзьмі — адно замілаванне. Едзеш у пустым вячэрнім вагоне, а ў галаве лунаюць вечныя думкі: як цудоўна, што ў наш час, калі іншы раз цяжка даверыцца нават знаёмым, калі пануюць бясконцыя супярэчнасці і крыважэрныя канфлікты, ёсць месца простай чалавечай дабрыні...

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
*veronika.ulasevich@mail.ru*

■ Вазьму твой боль...

# Дапамог бы, каб ведаў як




**НА парозе маёй кватэры — сціплы мужчына ахайнага выгляду. «Не дасце чаго-небудзь паесці?» Я якраз гатую вячэру — з кухні ідуць пахі. Кідаюся да халадзільніка, ад яго — да стала, ператрасаю кухонныя шафы. Што яму даць? Я панікую і бянтэжуся. Выношу маленькі пакет, які ён з удзячнасцю кладзе ў сваю сумку і знікае ў ліфце. Вяртаюся на кухню і ў спакойным стане пачынаю заўважаць вялікую колькасць прадуктаў, якія магла б даць гэтаму чалавеку. І яшчэ два дні ў маёй галаве будзе круціцца спіс ежы і мальба, каб ён вярнуўся.**

Мяркую, з вамі таксама здаралася такое: спачатку не можаце спакойна думаць, а потым шкадуеце, што не прынялі правільнае рашэнне. Але вы не здольныя вярнуцца назад і змяніць яго. Пад наплывам эмоцый людзі не мысляць шырока. Таму я пішу гэту памятку для сябе і для вас. Як дапамагчы, калі хочаш зрабіць гэта, але не ведаеш як.

Я разгубілася перад галодным чалавекам, бо не валодала інфармацыяй пра сітуацыю. Ёсць у яго дом ці жыве на вуліцы? Даць крупы ці падыдзе толькі гатовая каша? Мае халадзільнік ці возьме тое, што доўга захоўваецца? Зможа есці ёгурт ці не мае лыжкі? Жыве адзін ці з сям'ёй? Ёсць дзеці, якога ўзросту? Такія пытанні круціліся ў маёй галаве, калі я пяты раз адкрывала халадзільнік і разгублена глядзела ў яго. Адкуль я магла ведаць? Правільна! Ад самога госця. Варта было проста выйсці да яго яшчэ раз і задаць пытанні, каб намаляваць просьбу рознакаляровымі фарбамі і ведаць, што з ёй рабіць. Мне ж хацелася хутчэй адпусціць чалавека. А запытайся я, удакладні, сэканоміла б час на пошуках і кіданні па кухні.

...Я выходжу з царквы. На дзядзінцы — некалькі жабракоў. Заўсёды мінаю іх. Бо і выглядаюць нясвежа, і доказаў ніякіх. (У інтэрнэце прасцей: пачытаў гісторыю, праверыў дакументы — і ведаеш, каму і на што дапамагаеш.) Я даўно пазбавілася згрызотаў сумлення, мінаючы такіх жабракоў.

А тут маладая жанчына з плакатам і фотаздымкам дзіцяці: «Дапамажыце на аперацыю». У вочы зазірае. Я таксама з дзіцём — шукае падтрымкі і разумення. Ці спекулюе маімі мацярынскімі пачуццямі? Ведаеце, колькі такіх стаіць у розных кутках горада? Не веру. Мінаю. А яна — бліжэй падыходзіць: «Хоць колькі!» Даўно заглушаныя згрызоты прачынаюцца. Спыняюся на хвіліну. Спрабую думаць. Але зноў гэта паніка, наплыў эмоцый, боязь падману — яны раскладаюць на лапаткі разумны падыход. Я хапаю каляску і шыбую далей. Ужо не азіраючыся.

Што б вы думалі? Згрызоты не змаўкаюць яшчэ два дні.

І ўжо пасля, у спакойным стане, вярнуўшыся ў звыклыя абставіны, я змагла задаць сабе пытанне: «Чаму ж не спытала ў яе падрабязнасці, не папрасіла дакументы? Я магла дзейнічаць па ўжо звыклай схеме, з якой працую ў «Клубе 5000». Якое захворванне? Што за аперацыя? Дзе плануюць рабіць? Пакажыце калькуляцыю з клінікі, дзіцячае пасведчанне інваліднасці. Можна яшчэ набраць некалькі элементарных пытанняў, у якіх вы і самі не разбіраецеся. Скажам, чаму выбралі менавіта гэту клініку, якія прагнозы даюць урачы пасля аперацыі, ці спатрэбіцца дадатковае лячэнне, колькі будзе каштаваць пералёт і інш. Іх варта задаць, каб папросту паглядзець на рэакцыю. І ўжо пасля рабіць высновы: падманваюць вас ці не, дапамагчы ці прайсці міма.

Мае знаёмыя, ведаючы, што займаюся дабрачыннасцю ў дзіцячай анкалогіі, дасылаюць сваіх знаёмых з такімі праблемамі. Безумоўна, не магу ім адмовіць. Згаджаюся і прымаю ўсіх па рэкамендацыі. Але большасць адсейваецца пасля першай размовы.

Я задаю шмат пытанняў, каб размаляваць чорна-белую карціну і зразумець, у чым канкрэтна патрэбна дапамога. Часта высвятляецца, што людзі самі не ведаюць, чым ім дапамагчы. Проста разгубіліся і запанікавалі. Як я, калі сустрэла галоднага на сваім парозе. Я ведаю, што ім патрэбна падтрымка і суцяшэнне. Расказваю пра свой досвед і назіранні, распавядаю магчымыя варыянты дзеянняў і абяцаю прымаць іх званкі ў любы час.

Больш яны не тэлефануюць. Таму што супакойваюцца і бяруцца за барацьбу. Самастойна. Бо могуць сабе гэта дазволіць і разумеюць, што «Клуб 5000» існуе для тых, у каго значна горшае становішча і каму самастойна з ім ніяк не справіцца.

Вось што робяць правільныя пытанні, уменне іх задаваць, здабываць інфармацыю і працаваць з ёй. Усяго некалькі простых пытанняў могуць даць людзям неабходную дапамогу, а вас — пазбавіць ад двухдзённых згрызотаў.

Хочаш дапамагчы і не ведаеш як? Задавай пытанні. Нават калі бракуе часу, яны не патрацяць яго, а дапамогуць сэканоміць. Калі здолееш успомніць гэта правіла ў наступным ступары, раскажу вам пра вынікі.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

# ЛЮБОЎ — ГЭТА ДЗЕЯСЛОЎ

## ЗА ІЛЬЮ ПЕРАЖЫВАЕМ УСЁЙ СЯМ'ЁЙ

**— Тыповае ўяўленне, што жанчына мусіць займацца домам, а мужчына — зарабляць грошы. У вас гэта працуе?**

**І.:** Наконт другой паловы не ведаю, а першая — добра ўсё робіць. Жанчына спраўляецца.

**Т.:** Мужчына таксама!

**І.:** Таня ўсё паспявае і ў доме, і з дзецьмі, і яшчэ займаецца ў опернай студыі. Мне пашчасціла.

**— Як адчуваеце: вы супрацьлегласці альбо абое рабое?**

**Т.:** Мы вельмі падобныя ў густах, у заўзятасці да музыкі, але па характары хутчэй супрацьлегласці. Ды так і не бывае, каб былі цалкам падобныя ці наадварот.

**— Дзве творчыя асобы ў сям'і — гэта выпрабаванне ці здабытак для пары?**

**І.:** Мы пазнаёміліся яшчэ ў музычным вучылішчы і разам яго закончвалі. Так атрымалася, што я раней трапіў у тэатр, а ў гэты час у нас якраз з'явіўся Лука, таму Таня была з ім і не магла займацца кар'ерай. Бабулі і дзядулі, нашы таты і мамы з абодвух бакоў жывуць не ў Мінску. Адны ў Гомелі, а другія ўвогуле ў ЗША. Таму мы выхоўваем дзетак самі. Таня яшчэ на той момант паралельна вучылася і ўладкоўвалася працаваць у тэатр памочнікам рэжысёра. Цяпер дзеці падрастаюць, і ў яе становіцца больш часу, каб развівацца прафесійна. Мы часам выступаем разам, у нас ёсць некалькі сумесных нумароў, удзельнічаем з імі ў канцэртах і запрашаем на іх усіх ахвотных.

**Т.:** Зразумела, калі ў два чалавекі ў сям'і ездзілі на гастролі, было б вельмі складана. У гэтым плане ў Ілы надзейны тыл. Ён з'язджае — я з дзецьмі. У мужа ёсць дом, дзе яго любяць і заўжды чакаюць.

**— Рашэнне аб удзеле ў праекце «Вялікая опера» вы прымалі разам?**

**І.:** Таня — мой імпрэсарыа, агент, сакратар, піяр-менеджар. Пытанні, якія звязаныя з любога кшталту падачай заявак, арганізацыяй гастроляў, цалкам ляжаць на яе плячах. Увогуле гэта жонка мне паказала, што можна паўдзельнічаць. Я быў не супраць. Так атрымалася, што мяне адабралі і ў выніку заняў трэцяе месца сярод фіналістаў конкурсу.

**Т.:** Я толькі «за» і заўжды прасоўваю яго ў гэтым. Калі адчуваю, што ўдзел у конкурсе Ілы будзе карысным і цікавы, кажу яму. Калі ён выступаў у «Вялікай оперы», перажывалі ўсёй сям'ёй.

## ПАМІЖ ЗМОРАНАСЦЮ І АСАЛОДАЙ

**— Колькі часу праводзіце з дзецьмі?**

**І.:** Калі я дома, то заўжды з дзецьмі. На гастролях таксама стараемся быць разам. Апошні раз былі ў Італіі ў мінулым месяцы, падчас дадатковых канікул Лукі. Я выступаў, а Таццяна з дзеткамі прыехала на дзесяць дзён адпачыць і пабыць разам.

**— Як у Мінску бавіце час?**

**Т.:** Мы аматары схадзіць у лазню ўсёй сям'ёй. Дзеці любяць басейн, а мы з мужам саўну. Вечарынкі не наведваем.

**І.:** У нядзелю абавязкова ходзім разам у царкву. Дзеткі — у нядзельную школу.

**— Ілья, адпускаеце жонку, каб яна зрабіла штосьці выключна для сябе?**

**Т.:** Адпускае, але мне самой не хочацца, бо цікава быць з дзецьмі. Вядома, хаджу раўняць валасы і рабіць манікюр. Але схадзіць з сяброўкамі ў кавярню — не.

**І.:** Чаму ж не пускаць? Пускаю. Адзін раз на год. *(Смяюцца.)* Памятаю, нядаўна яны хадзілі гуляць разам з сяброўкай. У мінулым годзе. Якраз і атрымліваецца, што раз на год.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ»).*

**Т.:** Мужчынам цяжка заставацца з дзеткамі сам-насам.

**— Дарэчы, Ілья, як вам гэта?**

**І.:** Час ідзе марудней, а званкоў Тані робіцца больш. Мультыкі дапамагаюць, можна на машыне пакатаць. Пасля такога дня я пачынаю яшчэ больш цаніць той час, які жонка праводзіць з дзеткамі.

> **«Я сам выхаваны ў хрысціянскай сям'і і дакладна ведаю, што можна не дадаць чагосьці ў інтэлектуальным плане, але важна перадаць маральныя, духоўныя перакананні і каштоўнасці».**

**— А вам, Таццяна?**

**Т.:** Аднойчы ў мяне забралі дзяцей на тыдзень, я засталася адна і не разумела, што трэба рабіць. Паўсюль парадак, чыста, не трэба прыбірацца няспынна.

**І.:** Да 8 Сакавіка анекдот. У маці запыталі, чаго б яна хацела? «Палежаць у ванне... адна! З'есці цукерку з кавай... цэлую!» — адказвае яна. Гэта такі стан, калі знаходзішся паміж крайняй зморанасцю і асалодай адначасова. Сёння дзеці ўжо а шостай раніцы падняліся.

**Т.:** Лука падбягае і кажа: «У мяне для цябе важная навіна. Адна мая ноздра дыхае, а другая — не».

**— Як прыдумалі такія цудоўныя імёны?**

**Т.:** Мы хацелі незвычайнае, але і не надта адметнае імя. Абавязкова біблейскае. Сын Лука, што значыць «які нясе святло», і Алівія — «якая нясе мір». Мы верым, што імя ўздзейнічае на лёс чалавека.

**— Як думаеце, здольнасць да творчасці закладваецца на генным узроўні ці ёй можна навучыцца?**

**І.:** Перш за ўсё, гэта мусіць быць прыроджаная здольнасць. Навучыць асобу самавыражэнню — гэта складана, бо яно павінна ісці знутры чалавека, гэткая неспатольная прага. Мы аддалі Луку ў ліцэй пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, які калісьці скончылі самі. На харавое аддзяленне, якое скончыў я.

Для мяне важна, каб сын вырас годным чалавекам. Не пабаюся гучнага слова — патрыётам. Каб адказваў за свае ўчынкі. Наша задача як бацькоў — раскрыць у ім тыя таленты, якія заклаў Бог. Зараз Лука займаецца музыкай, футболам, у яго вельмі добра з матэматыкай.

**Т.:** Ведае курс долара, сочыць за ім, любіць лічыць.

**І.:** Што дасць расток, тое і будзем падтрымліваць. Мне не хочацца, каб сын браў вяршыні, якія не ўзяў я, любой цаной.

**— Калі з цягам часу зразумееце, што сыну болей не падабаецца спяваць, зменіце школу?**

**І.:** Я хачу, каб ён адшукаў сваё прызначэнне. Калі гэта не спевы, то што мы зробім? У любым выпадку цяжка ўявіць на пачатковым узроўні лепшую адукацыю для дзіцяці, чым у ліцэі. Лука вучыцца ў элітнай навучальнай установе, у якой працуюць мэтанакіраваныя, годныя педагогі. Мы не задумваемся, але часам праз выступы яе выпускнікоў, праз іх перамогі на прадстаўнічых конкурсах, пра Беларусь даведваецца больш людзей па ўсім свеце, чым праз працу дыпламатаў. Кожны дзень вазіць у ліцэй Луку каштуе мне лішнія паўгадзіны, але я раблю гэта, бо лічу, што там ён знаходзіцца сярод матываваных і ў будучым паспяховых дзяцей.

**— А як можна выхаваць любоў да роднай зямлі?**

**І.:** Толькі сваім прыкладам. Стаўленнем да бацькоў, да жонкі. Нават у тым, што ніколі не кідаеш смецце на падлогу. Толькі пасля ўжо даваць чытаць правільныя кнігі.

**— І як ставіцца да жонкі?**

**І.:** Любіць. Бо любоў — гэта не назоўнік, а дзеяслоў. Яна праяўляецца ў штодзённых учынках, у дробязях. Пачуцці прыходзяць і сыходзяць. Важна тое абяцанне, якое даваў ля алтара, заўжды памятаць і выконваць. Дзеці гэта бачаць, назіраюць і пераймаюць. Так, канфлікты здараюцца, і ў маіх бацькоў яны былі, але я бачыў іх стаўленне адно да аднаго.

**Т.:** Згодна. Ніякія словы, калі яны ідуць у разрэз з учынкамі, не выхаваюць дзіця належным чынам.

**— Вы прыхільнікі ранняга развіцця? З годзіка вучыць англійскую мову, напрыклад?**

**І.:** Не. Усяму свой час.

**Т.:** Я не лічу, што той, хто гэтак робіць, не мае рацыі. Напрыклад, у нас так не атрымлівалася. Я вучылася, Ілья працаваў. Дзеці заўжды раслі з намі. Мне бабуля казала, што самае лепшае — гэта калі дзіця бачыць, што робіш ты. Гатуеш — пастаў побач на крэсла, чытаеш — пасадзі і гартай старонкі разам. Мы так і рабілі. Дзе б ні былі, дзеці ўсюды з намі, бо іх няма з кім пакінуць.

**І.:** Я сам выхаваны ў хрысціянскай сям'і і дакладна ведаю, што можна не дадаць чагосьці ў інтэлектуальным плане, але важна перадаць маральныя, духоўныя перакананні і каштоўнасці. І самае галоўнае — веру ў Бога. Добра, калі ёсць магчымасць аддаць дзіця на шахматы ці калі яно здольнае вучыць вершы Сяргея Ясеніна на памяць. Але быць добрым чалавекам — перадусім.

## СНІЦЦА ДАРОГА ДА ВЯСКОВАЙ ХАТЫ

**— Да вашай сям'і такі ўсплёск цікавасці пасля «Вялікай оперы»...**

**І.:** Я быў вельмі здзіўлены, што ў нас людзі ўвогуле глядзяць гэту перадачу. Падбадзёрваючыя SMS, званкі ішлі з усёй Беларусі.

**— На дзецях адбіваецца гэта папулярнасць?**

**І.:** Насамрэч так. Лука гуляе ў анлайн-гульню на камп'ютары, дзе адзін шарык з'ядае іншы, і ён назваў свой шар «Ільёй Сільчуковым». І кажа: «Астатнія чытаюць і думаюць, што гэта ты, тата, таму мяне не з'ядаюць». І ён шчыра верыць, што ўсе ведаюць яго бацьку. У ліцэі яго прозвішча таксама на слыху, бо і я ж там вучыўся. З аднаго боку яму прасцей, бо ўсе ведаюць пра тату — опернага спевака, а з іншага — гэта накладвае на яго дадатковую адказнасць.

**— Якія моманты вы хацелі б выдаліць з сямейнага жыцця?**

**Т.:** Мне хацелася б болей высыпацца. Бо пакуль Алівія маленькая, ноччу даводзіцца прачынацца. А ў сем ужо трэба Луку збіраць у школу. А днём спаць не хочацца ды і няма калі.

**І.:** Я хацеў бы пазбавіцца ад лішняй вагі. На гастролях заўжды худзею, а пасля прыязджаю дадому, расслабляюся, пачынаю радавацца жыццю і зноў набіраю кілаграмы. А як да бабулі прыедзем — там боршч з грыбамі, смачныя аладкі, пірагі з макам ды з малачком...

> **«Што дасць расток, тое і будзем падтрымліваць. Мне не хочацца, каб сын браў вяршыні, якія не ўзяў я, любой цаной».**

**— Які ўспамін з дзяцінства хочацца перадаць дзеткам?**

**І.:** У маёй бабулі ёсць хата ў вёсцы каля Бярэзінскага біясфернага запаведніка, адразу побач з домам — рака Бярэзіна. Я вельмі сумую ўзімку па гэтых мясцінах. Часам нават у сне бачу дарогу да вясковай хаты, адчуваю смак таго самага паветра, супрацілленне рачной вады, калі плывеш... Там жа займаюся падводнай рыбалкай. У той вёсцы ёсць разбураны ў 1930-я гады касцёл. Я нядаўна раскапаў яго ганак, некалькі прыступак, бо больш нічога не засталося. Зрабіў афіцыйны запыт у Нацыянальны гістарычны архіў, але, на жаль, у іх не захавалася ніякай дакументацыі. Бярэзінскі парафіяльны касцёл быў выключаны са спісаў помнікаў архітэктуры. «Вось сімвал твой, забыты краю родны!», як пісаў Максім Багдановіч.

У мяне ёсць мара аднавіць яго. Але гэта будзе каштаваць некалькі мільёнаў долараў. Я лічу, што выхаванне праяўляецца і ў стаўленні да культурнай спадчыны, у шанаванні сваёй мінуўшчыны, аднаўленні створанага продкамі мураванага скарбу.

**— Пра што марыце?**

**І.:** Каб блізкія былі побач. Тыя, каго любіш, не хварэлі. І каб не было вайны.

**Т.:** У цябе мары, як у пенсіянера! *(Смяюцца.)*

**І.:** Можа і так, але гэта надта актуальна сёння. Зычу, каб у кожнага беларуса гэтыя пажаданні збыліся.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



■ Здаровая цяжарнасць

Дзіяна МАРДАС:

# «ЗМАГАЮСЯ З ПАГАЛОЎНЫМ УЖЫВАННЕМ ВІТАМІНАЎ»

**Першая цяжарнасць для кожнай жанчыны — час новых адчуванняў і перажыванняў. Апошнія ўзнікаюць не столькі з-за пэўных нязручнасцяў, колькі з-за невядомасці: чаго чакаць. Звычайна ў жанчыны паўстае вельмі шмат пытанняў кшталту:**
**якія змены адбываюцца з яе арганізмам;**
**што можна есці, а што не;**
**чым дазволена займацца,**
**а на што трэба забыцца;**
**як сябе паводзіць. На гэтыя і іншыя тэмы мы пагаварылі з акушэрам-гінеколагам Гарадскога клінічнага радзільнага дома №5 Дзіянай МАРДАС.**



***— Рана ці позна цяжарная пачынае шукаць адказы на свае пытанні...***

— І калі вы робіце гэта ў інтэрнэце, то лепш на медыцынскіх сайтах: пажадана, каб інфармацыя была падрыхтавана ўрачамі-спецыялістамі. Не карыстайцеся звесткамі блогаў і форумаў. Гэта ўсё індывідуальна і часта не адпавядае рэчаіснасці. Я іх сама нават праглядаю, і мяне часам ахоплівае жах, калі ўяўляю, што жанчына можа гэта прачытаць і будзе потым гэтым жа кіравацца. На жаль, паток інфармацыі нельга перакрыць.

Пачытайце спецыяльную літаратуру. Хоць знайсці «свайго» аўтара не так лёгка, але пэўныя звесткі атрымаеце. І, магчыма, самы просты шлях — запісацца на курсы па падрыхтоўцы да родаў. Амаль пры кожнай радзільні існуюць такія. Тут вас і дыхаць правільна навучаць, і як сябе паводзіць раскажуць, і ад небяспечнага перасцярагуць.

***— Калі ўсё ж такі да родаў не падрыхтаваліся з дапамогай літаратуры або курсаў, што рабіць?***

— Слухайце ўважліва доктара і выконвайце яго ўказанні. Памятайце, што падчас родаў вы з ім заадно і ён зацікаўлены ў найлепшым выхадзе не менш за вас.

***— Што трэба найперш зрабіць ці аб чым падумаць жанчыне, якая даведалася пра сваё «цікавае» становішча?***

— Найперш супакоіцца. Бо звычайна ў такія моманты пачынаецца паніка. Трэба ўсвядоміць, што цяпер ваш арганізм адказны за здароўе яшчэ аднаго чалавека. Таму адмоўцеся ад шкодных звычак. Па-другое, скарэктуйце харчаванне. Ежа павінна быць здаровай, насычанай вітамінамі і мікраэлементамі, дастаткова пажыўнай. Забудзьцеся пра дыеты. Калі прытрымліваецеся вегетарыянства, ужывайце больш бабовых. Выключце з рацыёну каву, бо яна спрыяе павышэнню тонусу маткі.

Знізьце фізічную актыўнасць. Адмоўцеся ад наведвання трэнажорнай залы і саўны, лазні. Супраць басейна нічога не маю. Не падымайце цяжкага (больш за 10 кг). Некаторыя цяжарныя, напрыклад, бяруць на рукі старэйшых дзяцей. Нельга таксама падымацца па лесвіцы пешшу больш за 10 паверхаў.

Абавязкова ў хуткім часе трэба стаць на ўлік у жаночую кансультацыю, каб прайсці ўсе неабходныя даследаванні, здаць аналізы. Добры кантакт з гінеколагам і выкананне ўсіх яго рэкамендацый — яшчэ адзін складнік здаровай цяжарнасці.

Спрыяльны мікраклімат у сям'і — таксама важны момант. Падчас цяжарнасці жанчына хоча адчуваць сябе любімай, абароненай, упэўненай у заўтрашнім дні. Не будзе залішняй і дадатковая ўвага з боку мужчыны. Гэта не застанецца непрыкмечаным.

Будзьце ўважлівымі з медыкаментамі. Рызыка пабочных з'яў значна ўзрастае. Памятайце, што ў першым трыместры адбываецца закладка ўсіх асноўных органаў і сістэм, і важна ў гэты час не нашкодзіць дзіцяці. Таму ніякага самалячэння!

Пры гэтым памятайце, што цяжарнасць — гэта абсалютна нармальнае становішча для жаночага арганізма. Рабіце ўсё, як у звычайным жыцці, толькі з папраўкай на новыя абставіны.

І ўласная парада: не стаўцеся да цяжарнасці проста, атрымлівайце асалоду ад гэтага становішча. Гэта асаблівы час, адпачывайце, калі хочацца, рабіце тое, што вам асабліва даспадобы: завядзіце альбом па падрыхтоўцы да нараджэння дзіцяці, рабіце фотасесіі з мужам.

***— А як наконт дадатковых вітамінаў у гэты перыяд?***

— Абавязковымі можна лічыць толькі фалievую кіслату ў першым трыместры. Яе лепш пачынаць прымаць яшчэ падчас планавання цяжарнасці. Вітамін Е і прэпараты ёду таксама будуць на карысць усім. А вось наконт полівітамінаў — шмат супярэчнасцяў. Увогуле не разумею, як можна стварыць такі полівітамін, які падыдзе абсалютнай большасці жанчын. У кожнай — уласная колькасць кальцыю, калію, жалеза... Справа ў тым, што з ежы дзіця «возьме» столькі карыснага, колькі яму патрэбна. А сінтэтычныя вітаміны ўбудоўваюцца ў арганізм бескантрольна, пры гэтым выцясняюць натуральныя, якія вы атрымліваеце з ежай. Іх трэба ўжываць выключна па паказаннях.

Сёння частая з'ява, калі худзенькая жанчына нараджае вялікае дзіця. Зразумела, гэта даецца ёй нялёгка. Пытаюся: «Прымалі полівітаміны? — «Усю цяжарнасць!» Памятайце, на здаровым, збалансаваным харчаванні дзіця ніколі не перабярэ ў вазе. Усё павінна адбывацца, як закладзена прыродай, нельга ўмешвацца. Таму я заўсёды змагаюся з пагалоўным ужываннем вітамінаў.

***— Многія сёння, наслухаўшыся пра цяжкасці натуральных родаў, думаюць аб тым, каб нараджаць праз «кесарава сячэнне».***

— Дзякуй Богу, гэта аперацыя ніколі не будзе ў нашай краіне ў ліку «платных паслуг па выбары». Яе робяць выключна па паказаннях! Калі жанчына можа радзіць сама, трэба стварыць для гэтага ўсе ўмовы. Кесарава сячэнне толькі здаецца лёгкай аперацыяй. Трэба пераканаць жанчыну яшчэ да родаў, што яна можа нарадзіць самастойна. Звычайна прыводжу прыклад цяжарнай, якой паказана было «кесарава», але яна да апошняй хвіліны настойвала на натуральных родах, нават прасіла дыягназ утаіць.

Пры гэтым можна сказаць, што колькасць аперацый складае каля 20 працэнтаў ад усіх родаў. Планавых «кесаравых» не так шмат, больш экстранных. У сувязі з гэтым хачу папярэдзіць цяжарных, каб падчас родаў не пілі шмат вадкасці, бо, калі што, анестэзіёлагу будзе цяжэй рабіць тэрміновы наркоз.

***— Пасля першага «кесарава» наступны раз самой таксама нельга нараджаць?***

— Не заўсёды. Усё залежыць ад тэрміну. Калі незадоўга да родаў шво ад аперацыі занадта тонкае, то існуе рызыка яго разыходжання, таму наступныя роды будуць таксама праз «кесарава». Натуральна, што шво будзе ў тым жа месцы. Калі ўсё добра загаілася і няма супрацьпаказанняў, нараджайце самі, на здароўе!

***— Сёння ўсё больш папулярнымі становяцца партнёрскія роды...***

— Кожны тыдзень, як правіла, адна пара нараджае ў нашай радзільні сумесна, бывае і дзве-тры. Вельмі добрая практыка. Па-першае, гэта сведчыць аб высокім узроўні даверу партнёраў, бо не кожны мужчына пойдзе на роды разам з жонкай, ды і не кожная жонка захоча, каб любімы чалавек быў з ёю ў гэтую хвіліну. Але такое сур'ёзнае рашэнне яны павінны прыняць разам. У любым выпадку нікога ўгаворваць нельга. І абавязкова да сумесных родаў трэба падрыхтавацца, прайсці спецыяльныя курсы, напрыклад.

***— Як хутчэй аднавіцца пасля родаў?***

— Зноў жа не ўпадаем у крайнасці. Ваш арганізм рыхтаваўся да родаў 9 месяцаў, цяпер у вас ёсць 9 месяцаў, каб аднавіцца. Ніякіх трэнажорных зал і дыет праз тыдзень пасля родаў. Але і не адкладвайце «на пасля». Праз паўтара месяца можна пачынаць займацца гімнастыкай. Дарэчы, ёсць цікавыя практыкаванні, якія магчыма рабіць разам з дзіцем. Харчаванне па-ранейшаму застаецца збалансаваным. Пасля родаў для жанчыны асабліва важны паўнавартасны сон. Дапамога таты будзе дарэчы. Ён таксама можа ўстаць ноччу да малога. Падзяліце паміж сабою сямейныя абавязкі.

У гэты час ужыванне полівітамінаў будзе якраз на карысць. Маці, якая корміць дзіця малаком, траціць шмат кальцыю, не ў лепшым стане знаходзяцца скура і валасы. Іх трэба ўвільгатняць, каб валасоў рабіць пажыўныя маскі. Калі інтэнсіўна губляеце валасы, звярніцеся да ўрача-трыхолага. Расцяжкі — яшчэ адна непрыемнасць. Дапамогуць салонныя працэдуры, але лепш пачакаць крыху, магчыма, скура сама адновіцца. Дарэчы, прафілактыку расцяжак можна праводзіць яшчэ падчас цяжарнасці — інтэнсіўна ўвільгатняць скуру.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ**



■ Нясумная прагулка

# КАПІТАН ДАЛЬНЯГА ПЛАВАННЯ,

## АБО ВЯСНОВЫЯ ЗАБАВЫ Ў ЛУЖЫНЕ

**Прыйшла вясна. Давайце паглядзім вакол. Што мы бачым? Як правіла, знаёмую карціну: на дзіцячых пляцоўках малыя корпаюцца ў мокрым пяску, катаюцца на бруднаватай горцы, гушкаюцца на арэлях. А мамы ў гэты час сядзяць на бліжэйшых лаўках, занятыя размовай адна з адной, альбо па тэлефоне з сяброўкай. Усё, што яны робяць — гэта перыядычна пазіраюць у бок сваіх дзяцей, каб яны не зваліліся, не пабіліся, не навеліся пяску. Але ж роля бацькоў на прагулцы зводзіцца не толькі да таго, каб гарантаваць бяспеку. Вядома, дзіцяці неабходны нейкі час для самастойнага пазнання свету, але вельмі часта бывае так, што сумна гуляць аднаму ці з іншымі дзецьмі — дапамажыце яму, разнастайце ваш шпацыр, зрабіце яго пазнавальным і цікавым!**

Ні для кога не сакрэт, што ўсе дзеці вельмі любяць лужыны. Але, большасць матуль забараняюць нават блізка падыходзіць да іх, маўляў, «намочыш ногі», «вымурзаешся». Парадуйце сваю крывіначку, дайце атрымаць асалоду ад таго, што ўсім астатнім дзецям забаронена. Але для гэтага, вядома, паклапаціцеся загадзя пра непрамакальныя боцікі і кантралюйце дзеянні малога.

Самая папулярная вясновая гульня для маленькіх капітанаў дальняга плавання — гэта **запускаць папяровыя караблікі** ў раўчукі. Пры гэтым можна зладзіць спаборніцтва з суседскімі дзецьмі і іх бацькамі: чыё судна далей дапльіве або даўжэй пратрымаецца і не перакуліцца. Тонкая папера хутка намакае, таму, калі плануеце спускаць караблі на ваду, складайце іх з фольгі ці калькі. Такі флот не тоне, яго можна выкарыстоўваць шматкроць.



**Схема вырабу простага папяровага карабліка.**

Сярод бяспечных гульняў з вадой, можна вылучыць яшчэ некалькі.

**«Мераць лужыны».** Лужыны бываюць розныя. Доўгія і кароткія, мелкія і глыбокія. Даўжыню і шырыню лужыны можна мераць у кроках, у ботах (рухацца, ушчыльную прыстаўляючы ногі), у палках ды хоць у... папугаях, калі яны апынуцца пад рукой. Мераць іх можна і «дзецьмі», і «татамі», і «мамамі», і «бабулямі», а потым дзівіцца неспадзяванbackslash выніку: лужына ў «татах», відавочна, будзе меншай за лужыну ў «мурашках», напрыклад. Калі дзіця падрасце, увядзіце паняцце «аб'ём». Часта ў маленькай на выгляд, але глыбокай лужыне аб'ём вады бывае большым, чым у велізарнай, але плыткай. Для дзіцяці гэта — сапраўднае адкрыццё.

**«Тоне — не тоне».** Набярыце калекцыю розных дробных непатрэбных рэчаў і тапіце іх у лужыне. Пры гэтым загадзя пацікаўцеся ў дзіцяці: тоне гэты прадмет ці не. Тады разам з ім вы здзейсніце нямала дзіўных адкрыццяў. Напрыклад, плоская пясочная формачка, кінутая ў лужыну ўверх дном, тоне, а тая ж формачка, перавернутая ў выглядзе карабліка, плыве. Калі надзьмуць пакет паветрам, ён будзе плыць, а пакуначак з загорнутым у яго каменьчыкам патоне. Галоўнае, пагуляўшы, не забудзьцеся прыбраць за сабой.

**«Падводны шукальнік скарбаў».** Да гэтай гульні трэба падрыхтавацца загадзя. Знайсці цікавы прадмет, які не баіцца вады і тоне, загадзя пакласці яго ў лужыну. І даць заданне малечы знайсці скарб. Шукаць можна з дапамогай палак, грабелек з пясочнага набору, ну ці рукамі, калі мама дазволіць. Для старэйшых дзетак можна яшчэ і намаляваць карту, па якой трэба знайсці патрэбную лужыну.

**Размалёўваем лужыны.** Нам спатрэбяцца некалькі лужын недалёка ад дома і харчовыя фарбавальнікі. Падыдуць і фарбы для велікодных яек. Прапануеце дзіцяці акуратна высыпаць парашок у лужыну і размяшаць палачкай. Вам абаім будзе цікава назіраць, як лужыны афарбоўваюцца ў вясёлыя жыццярадасныя колеры.

Такім чынам, мы бачым, што лёгка можна разнастаіць вясновы шпацыр, каб ён быў цікавым, карысным і прыемным для ўсіх. А як вы бавіце час са сваімі дзеткамі? Пішыце, дзяліцеся сваім досведам.

**Падрыхтавала Наталля ФІЛІМОНАВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**25.04.2016 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. №204 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг.**

**Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87**

| Адрес арендуемого имущества | № лота | Площадь, кв.м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, базовые арендные величины* | Размер задатка, базовые арендные величины* | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, гараж (принадлежность к зданию АТС-2), 1-й этаж, помещения Гродненская область, Лидский р-н, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3 | 1 | 64,6 | 1,0 | 16,15 * | 1,615 * | Помещения находятся на первом этаже одноэтажного кирпичного здания в центральной части города. В помещениях есть естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение площадью 64,6 кв.м является проходным. Вход в помещение площадью 15,8 кв.м осуществляется через помещение площадью 64,6 кв.м. Помещения находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 2 | 15,8 | 1,0 | 3,95 * | 0,395 * | |
| Изолированное помещение, административно-хозяйственное помещение, 3-й этаж, помещение. Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, б-р князя Гедимина, 3-7 | 3 | 15,7 | 1,5 | 3,925* | 0,3925* | Помещение находится на третьем этаже четырехэтажного здания в центре города. В помещении имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение находится в удовлетворительном состоянии |

** Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.*

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц – резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

*Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».*

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15% от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: **230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407 с 24.03.2015 по 22.04.2016 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 22.04.2016, не рассматриваются.**

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.**





## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «РАДИОВОЛНА»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | |
| **Предмет торгов, краткая характеристика, местонахождение** | Изолированное помещение с инв. № 400/D-89156 общей площадью 3461,1 кв.м, находится в кирпичном капитальном строении 1983 г.п., расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004442, по адресу: г. Гродно, ул. М. Горького, 89. Часть помещения сдается в аренду: S – 40,4 м² и 38,6 м² – по 14.03.2017 г.*; S – 54,1 м² и 19,9 м² – по 14.03.2019 г.*; S – 398,1 м² – по 28.02.2021 г.* <br>** – в случае отчуждения имущества на торгах, арендаторы обязуются расторгнуть договор аренды и освободить помещения в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи* | | |
| **Начальная цена** | **12 320 014 556 рублей с учетом НДС** | **Сумма задатка (5%)** | **616 000 730 рублей** |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. М. Горького, 89, тел. 8(0152) 437272 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 25 апреля 2016 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | По 19 апреля 2016 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8 | | |

Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, телефоны для справок: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11





ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

**Аукцион состоится 27 апреля 2016 года в 14.00**
**по адресу: 224030, г. Брест, пр. Машерова, 21 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».**

## Организатор аукциона – РУП «Белтелеком», в лице Брестского филиала,

**расположенного по адресу: г. Брест, пр. Машерова, 21.**

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

## ЛОТ №1: ПОМЕЩЕНИЯ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ, ПРОИЗВОДСТВЕННОГО ПОМЕЩЕНИЯ, общей площадью 106,6 кв.м (52,4; 54,2) в г. Барановичи Брестской области, ул. Советская, 81-1, 4-й этаж

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права – 26,65 базовой арендной величины, размер задатка – 2,665 базовой арендной величины, согласно п.8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 №150 установить коэффициент – 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

**Документы на участие в аукционе по объекту: Помещения изолированного помещения в г. Барановичи Брестской области, ул. Советская, 81-1, 4-й этаж принимаются с «25» марта 2016 года по «26» апреля 2016 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21, каб. № 416.**

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

- *перечисляет задаток на с/сч 3012100110001 филиал №100, Брестское областное управление АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 201003265;*
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Победителем аукциона признается участник**, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона** (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), **уплачивает штраф** в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефоны для справок: (8-0162) 20-28-88, 22-10-20, факс 22-15-42.**

УНП 201003265





Пуховичский районный исполнительный комитет

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**на право заключения договора аренды земельных участков, который состоится 27 апреля 2016 г. в 15.00 в зале заседаний райисполкома, расположенного по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227.**

НА АУКЦИОН БУДУТ ВЫСТАВЛЕНЫ:

**ЛОТ 1 – земельный участок (кадастровый номер 624475700101000386), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Руденский поссовет, д. Анетово, площадь – 0,0396 га, для размещения торгового объекта, срок аренды – 25 лет, начальная цена – 4 829 592 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 482 959 рублей.**

Имеется центральное водоснабжение, газоснабжение. Отопление и водоотведение отсутствуют.

*Потери сельскохозяйственного производства в сумме 5 404 680 белорусских рублей перечислять на расчетный счет 3602916010009. Получатель: Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, УНП 600003383, в ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Минск, код банка 795.*

**ЛОТ 2 – земельный участк (кадастровый номер 624482501601000460), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Голоцкий с/с, аг. Голоцк, ул. Центральная, площадь – 0,0801 га, для строительства торгового объекта, срок аренды – 25 лет, начальная цена – 22 438 044 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 2 243 804 рубля.**

Имеется центральное водоснабжение, газоснабжение. Отопление и водоотведение отсутствуют.

Наличие асфальтированного подъезда.

*Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на счет финансового отдела Пуховичского райисполкома, ф-л 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк» (код 601), сч. № 3600625000021, код платежа – 04616.*

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

**Кроме того, предоставляются:**

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, Пуховичский райисполком, 2-й этаж, к. 220 с 18 апреля 2016 г. по 26 апреля 2016 г. с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

Заключительная регистрация – **с 14.30 до 14.55 в день проведения аукциона по адресу: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227, зал заседаний райисполкома.**

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победитель аукциона вносит плату за право заключения договора аренды земельного участка: возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и государственной регистрацией в отношении созданного земельного участка; получает разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительного проекта на строительство объектов в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на право заключения договоров аренды по результатам аукциона, путём выезда на место нахождения земельного участка.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: **г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, к. 220, контактный тел.: 8 01713 35879 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**





СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР

**на привлечение независимых консалтинговых и инжиниринговых фирм для повышения качества производимой продукции и оптимизации вспомогательных служб с передачей этих функций на аутсорсинг:**

1. Обслуживание и ремонт оборудования.
2. Обслуживание и ремонт инженерных сетей.
3. Разработка и внедрение ERP-систем.

Предложения принимаются в течение 10 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123.
*Тел./факс 205 86 00, тел. 205 85 26.*
*Тельтевский В.Н.*

УНП 190050257





ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»

**проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества**

*Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»*

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1** | Капитальное строение с инв. №500/С-41303 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52/23. Площадь – 239,0 кв.м. Наименование – Здание складов. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000005000418, пл. 19,9465 га, предоставленным продавцу на праве долевого постоянного пользования (Доля: 1773/2500), с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га; Доля в праве постоянного пользования на земельный участок, относящееся к капитальному строению после регистрации перехода прав собственности – 3/1250. Объект недвижимости обременен договором аренды. Условия дальнейшего использования объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%)** | **Сумма, эквивалентная 76 608 долларам США** |
| **Задаток, 5%** | **Сумма, эквивалентная 3 830 долларам США** |
| **ЛОТ №2** | Капитальное строение с инв. №500/С-41310 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52/20. Площадь – 196,0 кв.м. Наименование – Мойка. Назначение – Здание специализированное для ремонта и техническогообслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000005000418, пл. 19,9465 га, предоставленным продавцу на праве долевого постоянного пользования (Доля: 1773/2500), с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га; Доля в праве постоянного пользования на земельный участок, относящееся к капитальному строению после регистрации перехода прав собственности – 235/100000. Объект недвижимости обременен договором аренды. Условия дальнейшего использование объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%)** | **Сумма, эквивалентная 78 408 долларам США** |
| **Задаток, 5%** | **Сумма, эквивалентная 3 920 долларам США** |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80 |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80 |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата стоимости приобретенного на аукционе объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи. Оплата задатка и лота производится резидентами в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа на следующие банковские реквизиты: р/с 3012000790020 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226, г. Минск, пр-т Победителей, 29. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка и лота производится нерезидентами в долларах США или в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа на следующие банковские реквизиты: Сч./Acc.: 3012000790020 (BYR); Сч./Acc.: 3012000790003 (USD) SWIFT CODE : BELBBY2X ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29 БИК: 153001226 Банк корреспондент CITIBANK N.A., NEW YORK SWIFT CODE: CITIUS33 Acc.36249772. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | **Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 21 апреля 2016 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 312** |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | **Аукцион состоится 25 апреля 2016 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»** |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей» | |

**Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 29 239 39 64, +375 44 580 63 02. E-mail: tushinskaya@horizont.bn.by**

# ПРЫШЧЭПКА ДЛЯ ЧЫТАННЯ



Удзельнікі «круглага стала» стараюцца знайсці рэцэпт, як і што пісаць, каб дзеці захапляліся кнігамі.

## Генетычная схільнасць або заслуга бацькоў?

Тэма дзіцячай літаратуры апошнім часам узнімаецца даволі часта і становіцца ўсё больш актуальнай. Асабліва праз шырокае распаўсюджванне сур'ёзных канкурэнтаў друкаваных выданняў: камп'ютараў, планшэтаў і тэлевізараў, адарваць ад якіх дзяцей досыць складана.

*— Цяпер стаіць задача не зацікавіць дзіця канкрэтным творам, а ўвогуле заахвоціць яго да чытання. Каб быць адукаваным, думаючым чалавекам, з якім проста прыемна пагаварыць, якой бы прафесіі ён ні быў, трэба чытаць,* — упэўнены **Аляксей ЧАРОТА, галоўны рэдактар часопіса «Нёман».** — *І ў гэтым*



*плане дзіцячы пісьменнік бярэ на сябе вялікую адказнасць, калі звяртаецца да маленькай публікі, у якой яшчэ не сфарміравалася псіхіка. Аўтары робяць значны ўнёсак у развіццё мастацкага густу дзяцей і нават пэўным чынам уплываюць на іх будучыню, на тое, кім яны захочуць стаць.*

Распаўсюджана меркаванне, што дзеці, якія чытаюць, растуць у сем'ях, дзе чытаюць бацькі. Аднак цяпер да гэтай умовы можна дадаць і стаўленне бібліятэкараў да маленькіх наведвальнікаў.

Адносіны да кніг у некаторых сем'ях ідуць літаральна з некалькіх слоў бацькоў, якія разам з дзецьмі прыходзяць браць выданні на лета: «Бязладдзе! Прымушаюць на вакацыях нейкім пазакласным чытаннем займацца!» А часам малое нават не трапляе ў залу, бо маці кажа яму: «Пасядзі на канапе, а я хуценька кнігі памяняю і прынясу, што табе там яшчэ задалі пачытаць».

*— Важна, каб дзіця не баялася зайсці ў бібліятэку. Шмат залежыць ад таго, як яго сустрэне бібліятэкар. Ці ён будзе сядзець, уткнуўшыся ў кнігу і нешта бурчаць пад нос, ці ветліва і з усмешкай пацікавіцца, што падказаць,* — выказалася **Святлана ЛАТОШ, загадчыца дзіцячай бібліятэкі №12.** — *Цудоўна, што*



*апошнім часам да нас пачалі прыходзіць сем'ямі, асабліва на выхадных. Бацькі сумесна з дзецьмі гартаюць кнігі, і відаць, што дарослым гэта таксама прыносіць задавальненне.*

Разам з тым сацыялагічнае апытанне бацькоў, дзяцей і бібліятэкараў, якое праводзілася спецыялістамі Нацыянальнай бібліятэкі некалькі гадоў таму, паказала, што 60% дзяцей не бачаць сваіх бацькоў з кнігай, а 40% малых адзначылі, што бацькі ім не чытаюць, агучыла лічбы **Вольга БАНДАРЧУК, вядучы метадыст навукова-даследчага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі.**



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



**Кіраўнік аддзела праектнай дзейнасці і міжнароднага супрацоўніцтва Маскоўскай абласной дзіцячай бібліятэкі Людміла МАКСІМАВА** расказала пра іх сумесны з Усерасійскай бацькоўскай асацыяцыяй вопыт па адукаванні бацькоў. Яна пагадзілася, што сучасныя таты і мамы сапраўды чытаюць мала, і пры кожнай дзіцячай бібліятэцы па магчымасці трэба было б заснаваць бацькоўскі клуб. Пакуль малыя выбіраюць кнігі, з дарослымі працуюць бібліёграфы.

*— На сайце асацыяцыі мы плануем ствараць вэбінары і выпускаць электронны часопіс, вывешваць навінкі літаратуры, творы, рэкамендаваныя да чытання, і нават спіс некарыснай літаратуры з рэцэнзіямі, каб бацькі маглі арыентавацца,* — распавяла Людміла Максімава. — *У нас нават вучацца цяпер па спецыяльнасці «цьютар установы культуры» — гэта чалавек, які ведае, што парэкамендаваць пачытаць.*

Думаецца, што своеасаблівыя псіхалагічныя прышчэпкі, якія б заахвочвалі да чытання, зараз патрабуюцца і дзецям, і дарослым. Аднак, магчыма, любоў да чытання ўвогуле закладзена генетычна і не залежыць ні ад якіх прымусаў ці заахвочванняў, лічыць **пісьменнік Генадзь АЎЛАСЕНКА:**



*— Мае бацькі чыталі не вельмі шмат, а вось я гарнуўся да кнігі. Можа, нежаданне дзяцей чытаць — гэта не сучасная праблема, а ва ўсе часы былі тыя, хто цікавіўся кнігай, і каго да яе было не зацягнуць.*

## Па вокладцы кнігу гартаюць, па змесце — чытаюць

Яркія вокладкі з цікавымі малюнкамі, незвычайныя формы і памеры, прозвішчы знакамітых аўтараў. На што толькі не ідуць выдаўцы, каб прыцягнуць увагу дзяцей і бацькоў. Аднак прыгожа ілюстраванае выданне не заўжды змястоўнае і якаснае. Асабліва калі гэта не нацыянальная літаратура, а перакладная, змест якой першапачаткова разлічана на менталітэт замежнага чытача.

*— Якасць зместу шмат якіх выданняў вымушае жадаць лепшага яшчэ і таму, што з'яўляецца шмат адаптаванай літаратуры, калі рэдактар проста пераказвае вольным стылем класічныя казкі. У выніку атрымоўваецца скарочанае і скажонае непаразуменне,* — выказаўся **пісьменнік Валерый КАСТРУЧЫН.** —



*Тое ж тычыцца і дарослай літаратуры. Уявіце сабе кнігі Дастаеўскага ці Талстога, якія ў замежным перакладзе змяшчаюцца на некалькіх старонках.*

**Яшчэ адна праблема дзіцячай літаратуры — узроставыя абмежаванні на вокладках накшталт «0+», «3+», «6+» і г.д., якія, на думку спецыялістаў, ствараюцца штучна і надумана. Гэты маркетынгавы ход, разлічаны на недасведчаных асоб, якія купляюць кнігі, толькі пагладзеўшы на лічбу, не пацікавіўшыся іх зместам.**

*— Дзіця перш за ўсё глядзіць у кнізе на малюнкі. У сучасных малых кліпавае ўспрыманне інфармацыі — ім трэба тры радкі звестак даць, бо далей ён проста чытаць не будзе,* — упэўнена **Вольга ЦІТОВА, загадчыца дзіцячай бібліятэкі №16.**



Прагучала таксама меркаванне, што падлеткі ўжо не кідаюцца, як сарокі, на бліскучыя вобразы. «Халодныя» камп'ютарныя карціны адштурхоўваюць ад сябе, і дзецям хочацца малюнкаў, створаных мастакамі ўручную спецыяльна пад творы.

Яшчэ адна праблема дзіцячай літаратуры — узроставыя абмежаванні на вокладках накшталт «0+», «3+», «6+» і г.д., якія, на думку спецыялістаў, ствараюцца штучна і надумана. Гэты маркетынгавы ход, разлічаны на недасведчаных асоб, якія купляюць кнігі, толькі пагладзеўшы на лічбу, не пацікавіўшыся іх зместам.

*— Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту напісана шмат: казкі, вершы, апавесці. Але ж хацелася б больш апавяданняў і невялікіх аповедаў. А ў кнігах для падлеткаў трэба ўздымаць пытанні іх узаемаадносін паміж сабой, стасункаў у сям'і, з настаўнікамі. На такія тэмы выходзяць нашы аўтары Валерый Гапееў і Алесь Бадак, але гэтага мала,* — зазначыла Вольга Цітова.

Не хапае кніг, якія дапамагалі б навучальнаму працэсу. Бібліятэкарам хацелася б бачыць на паліцах тэматычныя зборнікі на тэму сяброўства і таварыства, кнігі пра прыроду, прыгоды, пра што часта пытаюцца наведвальнікі. Адчуваецца недахоп кніг беларускай дзіцячай класікі: Якуба Коласа, Янкі Купалы, Васіля Віткі, Максіма Багдановіча, казак Уладзіміра Караткевіча, фармат якіх падыходзіў бы пад заплечнікі малых.

*— Пабольш хацелася б прыгодніцкіх кніг. Не фэнтэзі, якіх сёння мноства, а пазнавальных і блізкіх успрыманню дзіцяці сітуацый, калі элемент казкі накладваўся б на рэчаіснасць,* — дадала Святлана Латош.

*— Калі пісьменнік піша, ён не думае, ці актуальна тэма, якая прыйшла ў галаву з натхненнем. Калі ён будзе загадзя думаць, пра што напісаць, каб гэта было запатрабаваным, нічога не атрымаецца. Можа, таму і прабелы ў тэмах дзіцячых, што аўтары пішуць па натхненні, а не па актуальнасці,* — зрабіў здагадку Генадзь Аўласенка.

## Хочаш пісаць пра прыроду — ідзі ў лес

На думку **Алега ТРУШЫНА, члена Саюза пісьменнікаў Расіі**, творы пра жывёльны свет і



прыроду патрабуюць асаблівай увагі пры напісанні. Яны займаюць бадай што галоўнае месца ў літаратурнай галіне, бо нясуць дабрыню і міласэрнасць. На жаль, ніша выданняў такога кшталту не лічыцца камерцыйнай ні ў Расіі, ні ў Беларусі і з часам можа зусім апусцець.

*— Быць пісьменнікам-натуралістам — цяжкая праца. Каб пісаць пра прыроду, яе трэба дакладна апісваць з пункту гледжання біялогіі жывёл. Фактычна гэта фатаграфічная літаратура,* — заўважыў расійскі пісьменнік. — *Такія кнігі не пішуцца за сталом дома. У любое надвор'е, у любую пару года ты мусіш ісці ў лес, назіраць за наваколлем. Разам з тым, калі пішаш пра прыроду, міжволі закранаеш тэму патрыятызму, якая не займае ў творы першаснае месца, а гучыць быццам спакваля.*

Працягваючы тэму прыроды, Валерый Кастручын зазначыў, што пра яе, здаецца, напісана ўжо ўсё, і лепш, чым такія славутыя класікі, як Джэк Лондан ці Віталій Біянкі, сказаць ужо немагчыма. Застаецца хіба што раўняцца на іх, што таксама цяжка:

*— Часам, чалавек, які нарадзіўся і вырас у горадзе, раптам пачынае пісаць казкі пра мышанят і кацянят, палічыўшы, што гэта проста. Атрымоўваюцца такія фантазіі, што не трэба быць кандыдатам біялагічных навук, каб схапіцца за галаву, убачыўшы падобныя «шэдэўры». Хоць гэта і казка, але ж звяры ў ёй павінны быць пазнавальнымі.*

Атрымліваецца, каб проста пачытаць нешта, недастаткова аднаго жадання — лепш ведаць, што бярэш, каб не марнаваць свой час.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*
**Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.**





Захапляльны і прыгодніцкі свет кніг.

■ Фотаздымак з гісторыяй

# «ЯНЫ БЫЛІ НАШЫМІ ДРУГІМІ БАЦЬКАМІ»

**Гэты здымак выкладчыкаў-франтавікоў на конкурс даслала Галіна ДЗЕГЦЯРЭНКА, кіраўнік музея «Міласэрнасць і мужнасць» Барысаўскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа. «Такая картачка ёсць у сям'і кожнага з тых, хто на ёй прадстаўлены. Сфатаграфавацца ўсім разам заахвоціла адзіная жанчына на фота — гэта Марыя Іванаўна Лавер, выпускніца Барысаўскага медрабфака, затым Мінскага медінстытута. З пачатку вайны яна ўзначаліла палявы рухомы ваенны шпіталь, а затым была начальнікам санітарнай службы 23-га матарызаванага пантонна-маставога батальёна. 1418 дзён і начэй была на перадавой. Вайну скончыла ў Празе ў чыне капітана медыцынскай службы. Пасля вайны вярнулася ў Барысаў.**



**Выкладчыкі Барысаўскага медыцынскага вучылішча — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Сядзяць злева направа: Віктар Усовіч, Аляксей Іваноў, Марыя Лавер, Леанід Казлоўскі, Міхаіл Гапонаў. Стаяць злева направа: Дзмітрый Маёраў, Сямён Гофман, Васіль Сперанскі, Міхаіл Шлосберг.**

Папрацаваўшы інспектарам раённага аддзела аховы здароўя, перайшла на працу ў Барысаўскую медыцынскую школу завучам па просьбе Віктара Усовіча. Віктар Піліпавіч таксама прайшоў вайну, ваяваў на Волхаўскім, Ленінградскім і 1-ым Украінскім франтах. У снежні 1945 года ён вярнуўся ў Барысаў і стаў зноў дырэктарам двухгадовай медшколы. 17 гадоў быў кіраўніком навучальнай установы, а затым выкладаў грамадскія навукі на працягу 16 гадоў. У 1954 годзе пры ім адбылося пераўтварэнне медшколы ў медвучылішча, а ў 1955 годзе ён перадаў дырэктарскія паўнамоцтвы Марыі Лавер. Марыя Іванаўна стварыла і згуртавала свой калектыў выкладчыкаў, сярод якіх былі ваенныя ўрачы, якія прайшлі вайну і мелі вялікі вопыт працы ў медыцыне.

Злева ад Марыі Іванаўны — Леанід Уладзіміравіч Казлоўскі, кавалер ордэна Славы III ступені. Па заканчэнні медінстытута прыбыў па накіраванні ў медвучылішча ў якасці выкладчыка акушэрства і гінекалогіі, а затым быў прызначаны намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце і на гэтай пасадзе адпрацаваў 25 гадоў.

Аляксей Іванавіч Іваноў — удзельнік баёў на поўдні СССР: Краснадарскі і Стаўрапольскі край, Таманскі паўвостраў, затым Украіна, Польшча, Чэхаславакія. Маючы вопыт службы ў якасці камандзіра ўзвода санітараў-насільшчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, аддаў навучанню і выхаванню маладога пакалення 15 гадоў і заўсёды падкрэсліваў, што вучыцца ніколі не позна. Маючы фельчарскую адукацыю, ён ва ўзросце 42-х гадоў паступіў у Мінскі медінстытут на біялагічны факультэт. Гэта стала прыкладам для навучэнцаў цягі да ведаў — жывым і яскравым. Такім ён быў заўсёды: чалавек высокай культуры, інтэлігентнасці, высакароднасці.

Міхаіл Гапонаў выконваў свой прафесійны абавязак медыцынскага работніка з першых дзён вайны ў дзейнай арміі на Заходнім, Сталінградскім, Данскім, 2-ім і 3-ім Украінскіх франтах. Пасля звальнення з войска ўзначальваў пункт аховы здароўя завода гідраапаратуры і адначасова вучыўся ў БДУ на гістарычным факультэце, а затым з 1965 года дваццаць гадоў выкладаў у медвучылішчы грамадскія навукі.

Міхаіл Шлосберг прайшоў вайну ад чырвонаармейца-фельчара да маёра медыцынскай службы. Першае баявое хрышчэнне атрымаў у верасні 1942 года ў Варонежскай вобласці — выцягваў параненых салдат, перавязваў іх і адпраўляў у шпіталь. Вызваляў гарады Украіны — Кіеў, Днепрапятроўск, Адэсу, а затым Еўропу. Ва Узброеных Сілах СССР праслужыў 27 гадоў. У 1969 годзе, звольніўшыся з войска па выслузе гадоў, прыйшоў выкладаць анатомію і мікрабіялогію. 17 гадоў перадаваў моладзі свае веды і вопыт.

У 1971 годзе ў медвучылішча прыйшоў выкладаць пачатковую ваенную падрыхтоўку Дзмітрый Маёраў, які прайшоў вайну ад камандзіра ўзвода да начальніка інжынернай службы палка, ад лейтэнанта да падпалкоўніка. Ён умела выкладаў свой прадмет, сумяшчаючы тэорыю з паэзіяй, песнямі, музыкай — добра іграў на фартэпіяна. У медвучылішчы працаваў 15 гадоў. Дзмітрый Дзмітрыевіч быў і застаецца да сённяшняга дня Ганаровым салдатам 7-га Таруньскага ордэнаў Аляксандра Неўскага і Чырвонай Зоркі інжынернага палка. Ён стаяў ля вытокаў яго фарміравання ў жніўні 1944 года. У гэтым палку ёсць музей, і ганаровае месца ў музеі адведзена Дзмітрыю Маёраву.

Сямён Гофман пачаў сваю ваенную біяграфію з пасады камандзіра санітарнага ўзвода ў жніўні 1943 года. Ваяваў на тэрыторыі Румыніі, Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі. З лютага 1972 года выкладаў у медвучылішчы фізіятэрапію, іншыя лячэбныя дысцыпліны.

У 1973 годзе пасля звальнення з арміі ў медвучылішча прыйшоў Васіль Сперанскі. За плячыма былі суровыя гады вайны — старшы лекар санітарнага батальёна 199-га зенітна-артылерыйскага палка. Са сваім падраздзяленнем прайшоў больш за 3300 км: Арол і Бранск, Камянец-Падольск і Львоў, Карпаты і Сандамірскі плацдарм, Польшча, Берлін, Прага. Імя Васіля Міхайлавіча занесена ў кнігу «Стальным таранам» — пра 4-ю танкавую армію, у якой у гады вайны ён меў гонар служыць. З 1975 па 1981 год узначальваў вытворчую практыку і выкладаў неўралогію.

У музеі пра іх ёсць вялікі фотаальбом «Яны змагаліся за Радзіму», а таксама асобныя міні-альбомы аб кожным з іх — матэрыялы, перададзеныя ў музей роднымі і блізкімі.

Выпускнікі нашай навучальнай установы вельмі добра памятаюць сваіх выкладчыкаў і на юбілейных выпускных вечарах і сустрэчах, збіраючыся ў музеі, глядзяць альбомы, дзеляцца ўражаннямі і пакідаюць свае запісы ў кнізе водгукаў.

«Усе яны былі ў прынцыпе нашымі другімі бацькамі. Яны нас хвалілі, дакаралі за правінначсці, падбадзёрвалі, калі былі няўдачы, і ўсялялі веру ў лепшае, але трэба абавязкова старацца і працаваць». (2010 год, выпускнікі 1975 года).

«Калектыў выкладчыкаў і мы — гэта была адна дружная сям'я, у якой настаўнікі былі бацькамі, а мы іх дзецьмі. Мы іх вельмі любілі, паважалі, абагаўлялі. Яны вельмі цікава падавалі свой прадмет, прыводзячы канкрэтныя прыклады са свайго ваеннага жыцця і вялізнага вопыту. Мы верылі ім і разумелі, што выбралі самую гуманную і патрэбную прафесію». (2014 год, выпускнікі 1979 года).

Чым далей сыходзіць час, тым больш востра выяўляецца цікавасць да свайго мінулага, і ўнукіпраўнукі хочуць ведаць больш пра сваіх сваякоў. Вясной 2015 года мы атрымалі запыт ад унука Васіля Сперанскага, які пражывае ў Расіі, з просьбай даць звесткі пра яго дзядулю. Атрымаўшы падрабязную інфармацыю, Коля Пятроў адказаў: «Вялікі дзякуй, абяцаю наведаць ваш музей».

**АД РЭДАКЦЫІ: Шаноўныя чытачы, вельмі прыемна, што конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» выклікае такую цікавасць. Мы атрымліваем вялікую колькасць пажоўклых ад часу фотакартак з цікавымі аповедамі. Многія тэлефануюць, каб перапытаць пра лёс свайго ліста, перажываюць, чаму доўга не выходзіць. Хочам усіх супакоіць, вашы лісты і здымкі чакаюць сваёй чаргі. А на днях патэлефанавала Таіса Несцяровіч з вёскі Клянік Смалявіцкага раёна (неверагодныя здымкі яе маці і таты выйшлі ў апошнім нумары «Сямейнай газеты») і сціпла папыталася, ці можна даслаць яшчэ некалькі картачак на конкурс. Маўляў, іх, цікавых, у сямейным альбоме шмат. Вядома, можна, тым больш, калі яны такія ж, як папярэднія — сапраўдная знаходка для этнографаў! Вам таксама ёсць што паказаць і расказаць? Тады далучайцеся! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры, за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.**

■ Дачны сезон

# ЭКСПЕРЫМЕНТУЙЦЕ — І ВЫЙГРАВАЙЦЕ

***Штогод вы распачынаеце дачны сезон з думкамі: ну, калі сёлета нічога не вырасце, кіну дурное? Вашы градкі нагадваюць поле бою, на якім вы прайграяце? Зімой вы пад расадай «гнаілі падаконнікі», вясной раскашэльваліся на плёнку, усё лета палолі-падвязвалі-пасынкавалі-палівалі, а сабралі ўсяго з паўвядра зялёных памідораў, і гэта яшчэ калі пашанцавала, што іх не «пабіла» фітафторай? Вы закупіліся добрай расадай капусты, але не змаглі ўправіцца з цэлай арміяй шкоднікаў, якія яе знішчылі? Цыбуля пагніла, морква пакруцілася, бульба не завязалася. Размову пра нашы дачныя беды можна працягваць... Але ж у суседзяў расце! І ў той час, пакуль мы скардзімся, нехта забівае склеп разнастайнымі нарыхтоўкамі са свайго агарода...***

***Значыць, вопыт удачлівых агароднікаў не менш каштоўны за тыя «праверaныя і дзейсныя» метады, якімі даўно карыстаецеся вы. Давайце дзяліцца сваімі сакрэтамі і збіраць добрыя ўраджаі.***

***Сёння сваімі парадамі наконт вырошчвання таматаў дзеліцца мінчанка Алена Дробава, якая мае лецішча ў Лагойскім раёне.***

**Сеем рана.** Звычайна агароднікі не раяць сеяць памідоры на расаду вельмі рана — маўляў, кусцікі, перарастуць, выцягнуцца. Але я не раз парушала такое правіла і ў цяпліцу высаджвала расаду з кветкамі і нават першай завяззю. Я заўважыла, што з перарасткамі няма праблем, калі іх правільна саліць у парнікі: абрываць лісточкі, укладваць у баразну і прысыпаць так, каб над зямлёй была толькі верхавіна. Не пужайцеся, што расада так «скарацілася». Вы заўважыце, як хутка яна ўвойдзе ў моц. А без развітай каранёвай сістэмы не сабраць вялікага ўраджаю.

Калі возіцеся з раслінамі, паспрабуйце ўявіць, як бы яны сябе паводзілі ў дзікай прыродзе. Доўгія галінкі гнуцца да зямлі і прарастаюць. І чаму б гэта не скарыстаць? Так, калі расада ўжо вялікая, а вывозіць яе на дачу яшчэ рана — проста перасаджвайце яе ў большыя ёмістасці (гэта могуць быць нават вялікія поліэтыленавыя пакеты) і падсыпайце да сцябла зямлі. У выніку яшчэ да перасадкі ў парнік вы атрымаеце дарослую расліну з магутнай каранёвай сістэмай і першыя чырвоныя памідорчыкі выспеюць менавіта ў вашым агародзе. На працягу ўсяго сезона падсыпайце да кожнага куста свежую зямлю (можна спецыяльна на вашым надзеле пакінуць невялікі ўчастак-донар). Сцябло будзе выпускаць у яе карэньчыкі і больш якасна падсілкоўваць вялікі куст, і ён парадуе вас ураджаем.

**Густа.** Люблю сеяць густа не толькі памідоры, але і перцы. Апошнія перасадкі не любяць, таму іх раяць адразу садзіць у персанальныя «дамкі». Але дзе расстаўляць такую колькасць скрыначак, тым больш што для прарастання насення іх трэба размяшчаць побач з батарэямі? Я не чакаю, як прынята, пакуль на расадзе з'явяцца першыя 2-3 сапраўдных лісты. Размяшчаю кусты па персанальных скрынках, як толькі яны ўзыходзяць. Нават далікатным перчыкам такая аперацыя не страшная. Іх карэньчыкі яшчэ маленькія і не пашкоджваюцца падчас перасялення. Акрамя таго, падобная ранняя перасадка — выдатны сродак прафілактыкі захворвання расады.

**Спяшаемся з навасёллем.** Вы не спрабавалі высаджваць расаду ў парнікі раней, чым гэта звычайна раяць рабіць? Апошнія два гады я частку расады сяліла ў парнікі яшчэ ў красавіку. І заўважыла: кусты, высаджаныя раней, нават, калі яны былі пашкоджаныя майскімі замаразкамі, абганялі ў росце сваіх больш позніх здаровых суседзяў. Добра, калі вы з пачаткам агароднага сезона можаце перабрацца на дачу і дапамагаць сваім раслінам штодзень, пры раптоўных замаразках дадаткова накрываць у парніку расаду на ноч. А калі не? Можна прыдумаць розныя спосабы, як захаваць цяпло — прысыпаць да бартоў парніка больш зямлі, каб ніадкуль не задувала, ды яшчэ засцяліць чорнай плёнкай, якая прыцягвае цяпло. Гэтай жа плёнкай можна пакрыць зямлю ўнутры парніка. Я высцілаю паміж кустамі сена, альбо свежаскошаную траву. Між іншым, травяная посцілка дапамагае захаваць зямлю і ад перасыхання, сэканоміць на паліве.

**Абрываем кветкі.** Памідорнае шчасце моцна залежыць ад надвор'я. Толькі ваш парнік заквітнеў — а тут моцная спякота, пры якой плады не завязваюцца. Ды і падчас працяглых дажджлівых дзён кветачкі могуць ападаць. Надвор'е наладжваецца — ды толькі вашы кусты ўжо адквітнелі і засталіся вы без ураджаю. Таму ўважліва назірайце за пасадкамі і шукайце гатункі, якія растуць і квітнеюць усё лета. Дарэчы, пры спрыяльных умовах за сезон вы можаце атрымаць з іх нават не адзін ураджай. У пахмурныя дні, мая сваячка многа корпаецца ў парніку — абрывае кветкі. Адквітнеюць расліны — і яна здымае з іх падвялыя «жоўтыя спаднічкі», каб тыя не загніліся і не пашкодзілі завязь.



**Пужаем расліну.** Мы цешымся з таго, што кусты абвешаны зялёнымі памідоркамі, а вось што зрабіць, каб яны хутчэй выспелі, тым больш, калі на двары ўжо жнівень, ночы халодныя, а пойдуць дажджы ды туманы — яшчэ і фітафтора нападзе. Самае простае — абрываць лістоту, выдаляць пасынкі, каб на плады свяціла больш сонейка. Акрамя таго, расліна, відаць, «пужаецца», што нашы здзекі не закончацца, і сама спяшаецца хутчэй вырасціць насенне.

Заўважыла: калі абрываць частку ўраджаю зялёным — астатнія плады хутка пачынаюць чырванець. Як быццам, расліна скінула цяжар і ачуняла, але яна не толькі хутчэй сваіх «дзетак» расціць, можа нават заквітнець і паспець парадаваць вас новым, познім ураджаем. Некаторыя агароднікі раяць зялёныя памідоркі, каб хутчэй спелі, адразу на кустах абвязваць пакетамі. Паспрабавала я і рэцэпт суседзяў (у іх адных з першых у нашай вёсцы чырванеюць таматы). Яны выстаўляюць па ўсім парніку адкрытыя бутэлечкі з ёдам (можна таксама пры паліве на вядро вады даваць некалькі кропель ёду). Можа, рэзкі пах таксама пужае расліну і яна задумваецца, ці не перашкодзіць ён вырасціць насенне.

***У кожнага з нас свой шлях да ўраджаю. А чаму б нам не крочыць разам? Чакаем вашых лістоў.***

Падрыхтавала
Ганна ТРОШЫНА.

*У СЯМЕЙНЫМ ЖЫЦЦІ САМАЯ ВАЖНАЯ ШРУБА — ГЭТА КАХАННЕ (Антон ЧЭХАЎ).*

Адказная за выпуск
Надзея ДРЫЛА.

## Ахоўнікі памяці

# ПАМІЖ АЗЁРАМІ БЕЛЫМ І ЧЫРВОНЫМ

### «Жывая гісторыя» незвычайнага партызанскага атрада сабраная пад адной вокладкай

**Журналіст Міхаіл Хільман усё жыццё прысвяціў вывучэнню гісторыі жыткавіцкага падполля. Ён працаваў на розных пасадах і ў розных друкаваных выданнях, але ж заўсёды знаходзіў час для работы ў архівах і гутарак з людзьмі, якія мелі дачыненне да партызанскага руху на Беларусі. І хоць даследаванне не ператварылася, як марыў у юнацтве, у навуковую дысертацыю, ужо на пенсіі Міхаіл Фёдаравіч напісаў гісторыка-дакументальную аповесць «У агні барацьбы». У ёй ён сабраў дакументы і ўспаміны, якія тычацца падзей 75-гадовай даўніны. Цяпер мара краязнаўца — устанавіць у Жыткавічах помнік, прысвечаны савецкім разведчыкам, якія дзейнічалі на Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны:**



— Гэта ўнікальны прыклад з гісторыі партызанскага руху, калі на акупаванай тэрыторыі змагалася вайсковая часць №44388 Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі. Яе ўзначальваў палкоўнік Рыгор Мацвеевіч Лінькоў. Камандзірамі атрадаў з'яўляліся афіцэры Чырвонай Арміі, масквічы па месцы нараджэння. Гэта былі чырвоныя дыверсанты першага набору. Іх рыхтавалі ў Народным камісарыяце абароны СССР і ў жніўні 1941 года выкінулі на васьмі самалётах у раёне Лепеля. На жаль, гэты дэсант быў няўдалы, у іх не было вопыту і многія трапілі пад нямецкія кулі. Людзей раскідала ў розныя бакі, але тыя, хто выжыў, змаглі выбрацца з балот і аб'яднацца. Каб урэшце здзейсніць шасцісоткіламетровы марш-кідок па акупаванай тэрыторыі Беларусі: ад Лепельскага раёна на Віцебшчыне да Жыткавіцкага — на Гомельшчыне. База часці дыслацыравалася паміж Белым і Чырвоным азёрамі, прыкладна на тэрыторыі, дзе цяпер знаходзіцца Мілевіцкі сельсавет Жыткавіцкага раёна.

Міхаіл Фёдаравіч у сваёй кнізе падрабязна расказвае пра лёсы людзей і падзеі, удзельнікамі якіх былі падпольшчыкі і партызаны. Дарэчы, іх называлі «бацінцамі». Таму, што мянушка камандзіра, палкоўніка Лінькова была «Баця». Івана Банава, яго намесніка па разведцы, звалі «Чорны».

— Усе ведаюць, што падчас вайны ў Мінску забілі генерал-камісара Генеральнай акругі Беларусі Вільгельма Кубэ, — працягвае Міхаіл Хільман. — Але мала хто ведае, што аперацыю арганізавалі «бацінцы» — адзін з іх атрадаў знаходзіўся пад Мінскам. Афіцэры і байцы вялі разведку, праводзілі дыверсіі, стваралі падпольныя групы на значнай частцы тэрыторыі Беларусі, Украіны, а затым і Польшчы. Падполле ў Жыткавічах было моцнае. З ворагам змагаліся цэлыя сем'і. Вопыту ў іх не было, але гэта былі людзі, адданыя сваёй краіне. І яны свядома ішлі на смерць. Многія з іх нават не атрымалі ўзнагарод за свае подзвігі.

Каб дэталёва вывучыць сітуацыю таго складанага ваеннага часу, Міхаіл Хільман падрабязна азнаёміўся з успамінамі савецкіх военачальнікаў, славутых партызанскіх камандзіраў, кнігамі вучоных-гісторыкаў. На працягу доўгіх гадоў ён збіраў матэрыялы па тэме, звяртаўся ў архівы, музеі, да сяброў — ваенных журналістаў.

Кніга прысвечана школьнаму настаўніку — Мікалаю Паўлавічу Каржу, які быў адным з кіраўнікоў жыткавіцкага падполля, а потым — камандзірам групы, намеснікам камандзіра брыгады партызанскага злучэння.



Рыгор ЛІНЬКОЎ (Баця).



Іван БАНАЎ (Чорны).

Дыверсійную і разведвальную дзейнасць, арганізацыю падполля і дапамогу мясцовым падпольным арганізацыям, а таксама асабістыя гераічныя гісторыі людзей Міхаіл Хільман апісвае на амаль 400 старонках кнігі. Ён малюе змрочную карціну акупацыйнага рэжыму — паказвае зверствы фашыстаў у адносінах да мірнага насельніцтва, распавядае пра карную аперацыю «Прыпяцкія балоты». Акрамя герояў, не забыты ў кнізе і антыгероі таго часу: памагатыя фашыстаў, паліцаі і іншыя калабаранты.

Такім чынам, заўважаюць ваенныя гісторыкі, аўтарамі кнігі зроблена ўдалая рэканструкцыя «жывой гісторыі» Вялікай Айчыннай вайны. На гэтую задачу працуюць і сабраныя фотаздымкі, а таксама рукапісы, карты, схемы, якія дазваляюць больш падрабязна і поўна ўявіць падзеі 1942—1943 гадоў.

Два гады таму ў вёсцы Юркевічы на будынку мясцовай школы па ініцыятыве Міхаіла Хільмана была адкрыта мемарыяльная дошка, прысвечаная памяці легендарнай падпольшчыцы, выпускніцы гэтай школы Яўгеніі Матвяец. Дзяўчына была сувязной бацінцаў з жыткавіцкім падполлем. Фашысты яе пакаралі смерцю. Ну а свае багатыя архівы Міхаіл Хільман плануе перадаць у музеі вайсковай славы, створаныя ў навучальных установах Жыткавіцкага раёна.

— Напэўна, мы разам з мясцовымі ўладамі прысвоім імя Героя Савецкага Саюза генерала Івана Банава школе №3, — марыць Міхаіл Хільман. — Там жа адкрыем музей. А мясцоваму прафесійна-тэхнічнаму ліцэю прысвоім імя Героя Савецкага Саюза Рыгора Лінькова. Яшчэ хачу адкрыць музей у Мілевіцкай васьмігадовай школе. Я сабраў вельмі шмат матэрыялу, які аддам у гэтыя музеі. Было б добра, каб імёны герояў-партызанаў былі прысвоены і вуліцам у Жыткавічах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*


ОАО «Белагропромбанк» сообщает о переформатировании сберегательной линейки с 01.04.2016. Приглашаем вкладчиков разместить денежные средства на новых условиях: в белорусских рублях до 30% годовых (по безотзывным вкладам) и до 24% годовых (по отзывным вкладам), в долларах США и евро до 5% (по безотзывным вкладам) и до 4% годовых (по отзывным вкладам), в российских рублях до 13% годовых. Подробная информация в подразделениях банка и на сайте.

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
**с 01 апреля 2016 года**

Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Срок, дни 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли*** | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 27,50 | 28,50 | 28,80 | 30,00 | 30,30 | 30,60 | 30,90 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 27,60 | 28,60 | 28,90 | 30,10 | 30,40 | 30,70 | 31,00 |
| 10 000 001 и более | 27,70 | 28,70 | 29,00 | 30,20 | 30,50 | 30,80 | 31,10 |
| **Доллары США*** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,10 | 4,40 | 4,70 | 5,00 | 5,25 | 5,40 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,20 | 4,50 | 4,80 | 5,10 | 5,30 | 5,45 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,30 | 4,60 | 4,90 | 5,20 | 5,35 | 5,50 |
| **Евро*** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,10 | 4,40 | 4,70 | 5,00 | 5,25 | 5,40 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,20 | 4,50 | 4,80 | 5,10 | 5,30 | 5,45 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,30 | 4,60 | 4,90 | 5,20 | 5,35 | 5,50 |
| **Российские рубли*** | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 6,30 | 6,60 | 6,90 | 7,10 | 7,60 | 7,90 | 8,20 |
| 15 001 – 150 000 | 6,40 | 6,70 | 6,95 | 7,20 | 7,70 | 7,95 | 8,30 |
| 150 001 и более | 6,50 | 6,80 | 7,00 | 7,50 | 7,80 | 8,00 | 8,50 |
| **Белорусские рубли**** | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| 10 000 001 и более | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| **Доллары США, евро, российские рубли**** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |
| 501 – 5 000 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |
| 5 001 и более | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |

Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Срок, дни 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли*** | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 9,00 | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 9,25 | 9,75 | 10,25 | 10,75 | 11,25 | 11,75 |
| 10 000 001 и более | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 | 12,00 |
| **Доллары США*** | | | | | | |
| 1 – 500 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Евро*** | | | | | | |
| 1 – 500 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Российские рубли*** | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 4,50 | 5,30 | 5,90 | 6,30 | 6,70 | 7,10 |
| 15 001 – 150 000 | 4,80 | 5,50 | 6,10 | 6,50 | 6,90 | 7,30 |
| 150 001 и более | 5,10 | 5,70 | 6,30 | 6,70 | 7,10 | 7,50 |

Настоящие ставки применяются:
* для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающими процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» (с плавающей процентной ставкой), утвержденных решением Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 16.02.2006, протокол № 21 (далее – Условия);
** для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающими процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, в случаях автоматического увеличения с 01.04.2016 срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life :), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by
белагропромбанк
ОАО «Белагропромбанк». УНП 100693551.


# КАМЕРТОНЫ «M.@RT.КАНТАКТУ»

**У Магілёве, нягледзячы на надвор'е з невялікім мінусам, сапраўдная тэатральная вясна. Здаецца, ад гарачыні тых эмоцый, якія кіпяць у кулуарах Міжнароднага тэатральнага форуму, нават на вуліцы цяплей. Як адзначаюць крытыкі,«M.@rt.кантакт» — адзін з фестываляў, дзе пануе сяброўская, амаль сямейная атмасфера. І моладзь у гэтай сям'і — галоўная дзеючая асоба.**

— Гэта фестываль маладых і для маладых, і ён сваё прызначэнне цалкам выконвае, — падкрэсліў **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ**. — «M.@rt.кантакт» знайшоў сваю нішу. Калі падыходзіць па ўзроставым прынцыпе, фестываль адпавядае інтарэсам большай часткі нашай маладзёжнай аўдыторыі, якая цікавіцца тэатральным мастацтвам. Вялікае прызначэнне форуму — яшчэ больш пашырыць кола тэатральных прыхільнікаў. Трэба яго не страціць. Уражвае высокі ўзровень арганізацыі мерапрыемства і падбор яго рэпертуару. Асабіста мне было б цікава ўбачыць усё, што пазначана ў фестывальнай афішы.

Карэспандэнтка «Звязды» спыталася ў міністра, які ўплыў зрабіў фестываль на тэатральнае мастацтва краіны за гады свайго існавання.

— Гэты фестываль не дае нам заставацца на ўзроўні адных толькі нашых дасягненняў. «M.@art.кантакт» — гэта заўсёды пошук, і яго задача сачыць за зменамі часу. Кожны год у нас з'яўляецца новы тэатральны глядач. Калі тэатр будзе адставаць ад часу, ён стане проста нецікавым моладзі. Яго прызначэнне — быць камертонам, які дае правільны гук для мастацтва ўвогуле і тэатральнага ў прыватнасці.



Гледачы мроілі разам з Бальзамінавым.

У Магілёў прыехалі вядомыя калектывы, рэжысёры, мастацтвазнаўцы, драматургі. Тэатр «Майстэрня» з Санкт-Пецярбурга на чале з яго мастацкім кіраўніком Рыгорам Казловым на фестывалі другі раз. З трупы звыш 50 чалавек самым старэйшым крыху за 30 гадоў. Усе артысты — выхаванцы гэтага тэатральнага мэтра, прафесара Санкт-Пецярбургскай тэатральнай акадэміі. Яго пастаноўку «Мроі кахання, або Жаніцьба Бальзамінава» тэатразнаўцы ўжо назвалі камертонам фестывалю. «Майстар вывеў на сцэну сваіх вучняў, і яны сыгралі філігранна», — адзначыла вядомы тэатральны крытык Таццяна Кікцева з Украіны. Гледачы таксама ўдзячны тэатру. Настаўніца гімназіі №1 Таццяна Луферава, якая прыйшла на спектакль разам са сваёй пляменніцай Вікторыяй, першая зрабіла хвалебны запіс у адрас стваральнікаў: «Сёння, калі класічныя творы перарабляюцца на іншы лад, трэба захаваць іх сутнасць. У тэатра гэта добра атрымалася».

Моладзь з магілёўскага каледжа мастацтваў з захапленнем удзельнічала ў майстар-класе па акцёрскім мастацтве, які даў у рамках фестывалю Рыгор Казлоў і яго маладыя артысты. Яны навучылі юнакоў і дзяўчат пазбаўляцца сцэнічнага страху і патлумачылі, чаму карысна хадзіць у... лазню. Дарэчы, яны самі першай справай у Магілёве наведалі гэтую ўстанову. Нават падчас спектакля ў зале глядач рэлаксаваў пад пахі венікаў, якія былі часткай дэкарацый, і тры гадзіны цярпліва мроіў разам з Мішачкам Бальзамінавым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

## Май на ўвазе

# ПІЛЬНАЯ ЎВАГА — ТЭХАГЛЯДУ

**Па 30 сакавіка УП «Белтэхагляд» разам з УДАІ МУС і Транспартнай інспекцыяй праводзяць рэспубліканскую сумесную дэкаду «Дзяржтэхагляд».**

Статыстыка сведчыць, што ад 17 да 23 працэнтаў аўтаўладальнікаў штогод ігнаруюць працэдуру дзяржтэхагляду, пакідаючы без увагі не толькі тэхнічны стан сваіх аўтамабіляў, але і бяспеку навакольных. Таму асноўная мэта акцыі — узмацненне кантролю за своечасовым праходжаннем гэтай працэдуры ўладальнікамі транспартных сродкаў і прыцягненне ўвагі аўтаўладальнікаў да пытання падтрымання апошніх у тэхнічна спраўным стане.

Рэйдавыя групы будуць найперш звяртаць увагу на аўтамабілі, якія эксплуатуюцца без дазвольнай налепкі на ветравым шкле. Таксама будуць правярацца транспартныя сродкі, што маюць яўныя неадпаведнасці па вонкавым выглядзе. Да асоб, што эксплуатуюць аўтамабілі без своечасова пройдзенага дзяржтэхагляду, будуць прымяняцца штрафныя санкцыі, памер якіх складае ад адной да трох базавых велічынь пры першым цягам года парушэнні, і ад дзвюх да пяці — пры паўторным. Асаблівая ўвага будзе нададзена кантролю за сапраўднасцю адзнак у дакументах аб праходжанні дзяржтэхагляду, для чаго будзе арганізаваны аператыўны доступ да электронных баз УП «Белтэхагляд». За падробку або выкарыстанне падробленых дакументаў, штампаў, пячатак прадугледжана крымінальная адказнасць уключна да пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полное наименование: Открытое акционерное общество

# «Чернавчицкий завод железобетонных изделий»

Адрес: 225030, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г, Брестский район, Брестская область

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

Единица измерения: млн руб.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 5 391 | 4 752 |
| Нематериальные активы | 120 | 4 | 5 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 38 | 38 |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | **5 433** | **4 795** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 2 989 | 2 549 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 4 | 1 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 3 | 3 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 830 | 1 750 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 215 | 53 |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | **4 041** | **4 356** |
| **БАЛАНС** | **300** | **9 474** | **9 151** |
| **Собственный капитал и обязательства** | | | |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 6 078 | 6 078 |
| Резервный капитал | 440 | 223 | 223 |
| Добавочный капитал | 450 | 764 | 352 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 1 024 | 1 070 |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | 8 089 | 7 723 |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 385 | 1 428 |
| **ИТОГО по разделу V** | 690 | 1 385 | 1 428 |
| **БАЛАНС** | **700** | **9 474** | **9 151** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | **12 888** | **20 794** |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | **(11 634)** | **(17 306)** |
| Валовая прибыль (010 - 020) | 030 | **1 254** | **3 488** |
| Управленческие расходы | 040 | **(1 684)** | **(1 940)** |
| Расходы на реализацию | 050 | **(189)** | **(236)** |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050) | 060 | **(619)** | **1 312** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | **374** | **559** |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | **(364)** | **(608)** |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060 + 070 - 080) | 090 | **(609)** | **1 263** |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | **664** | **116** |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | **(36)** | **(37)** |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | **-** | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | **-** | **(67)** |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности(100 - 110+120-130±140) | 140 | **628** | **12** |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±90 ±150) | 150 | **19** | **1 275** |
| Налог на прибыль | 160 | **(13)** | **(245)** |
| Чистая прибыль (убыток) (±160 - 170 ±180 ± 190 - 200) | 210 | **6** | **1 030** |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | **412** | **344** |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210 ±220 ± 230) | 240 | **418** | **1 374** |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | **0,000355** | **0,061008** |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | **0,000355** | **0,061008** |

| | |
|---|---|
| **Данные отчетности подтверждены:** | **Индивидуальный предприниматель Климович Майя Михайловна, свидетельство № 0265315 от 02.03.2011 г.** |

## Информация об ОАО

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): | | | **0** |
| **5-6. Информация о дивидендах и акциях:** | | | |
| **Наименование показателя** | **Ед. изм.** | **С начала года** | **За аналогичный период прошлого года** |
| Количество акционеров, всего | лиц | **114** | **114** |
| в том числе: юридических лиц | лиц | **0** | **0** |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | **0** | **0** |
| в том числе: физических лиц | лиц | **114** | **114** |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | **0** | **0** |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | **51,49** | **64,78** |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | млн руб. | **51,49** | **64,78** |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | **3050** | **3837** |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | руб. | **3050** | **3837** |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | **479,1** | **457,4** |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

| **7-8.Отдельные финансовые результаты** | | | |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | млн руб. | **12 888** | **20 794** |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | млн руб. | **13 507** | **19 482** |
| Прибыль (убыток)до налогообложения, всего | млн руб. | **19** | **1 275** |
| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | млн руб. | **-619** | **1 312** |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | млн руб. | **10** | **-49** |
| прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | млн руб. | **628** | **12** |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли | млн руб. | **13** | **245** |
| Чистая прибыль (убыток) | млн руб. | **6** | **1 030** |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | млн руб. | **1 024** | **1 070** |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | млн руб. | **0** | **0** |
| Долгосрочные обязательства | млн руб. | **0** | **0** |
| Среднесписочная численность работающих | человек | **79** | **82** |
| 9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | Производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий – 68,4% – 8816 млн руб. | | |

12. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 22 марта 2016 г.

15. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: Регламент работы ОАО с реестром владельцев ценных бумаг — утвержден общим собранием акционеров (протокол №15 от 24.03.2010). Положение об аффелированных лицах — утверждено наблюдательным советом общества (протокол №104 от 02.03.2011).

Директор ОАО С.В. Мороз

Главный бухгалтер В.И. Мануйлович

УНП 200034706

---

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу – (2РН, 2РП) серии БИ №№ 1460549, 1359367, 1376068, 1376094, 1376098, 1376114, 1376116, 1376124, 1376129, 1415451, 1415472, 1415517, 1415522, 1431784, 1431875, 1431876, 1490634, 1369026, 1250532, 1250562 – 1250564, 0989770, 1061031, 1061044, 1061045, 1061047, 1123515, 1123538, 1162081, 1162082, 1162083, 1198185, 1213660, 1214918, 1214927, 1214941, 1231450.

УНП 100782388

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТОВ С ТОРГОВ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона принадлежащего ЧСУП «ГринСад» **здания кинотеатра «Родина», инв. № 610/С-44663, общ. пл. 869,2 кв.м, расположенного в г. Борисов, проспект Революции, 15**, назначенного на 05.04.2016.

Извещение о проведении торгов было опубликованы в газете «Звязда» от 04.03.2016.

УНП 690832542

---

## ОАО «Белсолод» объявляет о выплате дивидендов за 2015 год в размере 8,885595 рубля на 1 акцию

Срок выплаты до 16.05.2016 г. Порядок выплаты: произвести перечисление дивидендов, приходящихся на долю Республики Беларусь, в республиканский бюджет до 22.04.2016, остальным акционерам – перечислить либо выплатить в кассе общества в срок до 16.05.2016 г. (выплата осуществляется по заявлению акционеров).

УНП 200075434

---

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ №1. Водка «Талер», 227,15 дал, разлив 2016, начальная стоимость лота – 467.578.540 белорусских рублей. Лот №2. Водка «Северная столица», 126,07 дал, разлив 2016, начальная стоимость лота – 232.527.110 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Витебский ликеро-водочный завод «Придвинье» |
| **Местонахождение имущества** | г. Витебск, ул. Революционная, 45. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества Коновалову Денису Сергеевичу, тел. 8 (029) 291-80-95 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белинвестбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 07 апреля 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 10.00 06 апреля 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены**

## ПО ПРОДАЖЕ АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ, инв. №500/С-46538,

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Платонова, д. 31а, принадлежащего унитарному предприятию «Поречье Белкоопсоюза» (Продавец) на праве хозяйственного ведения.**

Земельный участок площадью 0,0311 га с кадастровым номером 500000000008001584 предоставлен на праве аренды по 28.02.2022. Целевое назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания. Описание права, ограничения (обременения) прав: - охранная зона водопровода, площадь 0,0163 га; - охранная зона телефонной канализации, площадь 0,0062 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 821 760 000 бел. руб.**
**Задаток – 82 176 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже здания УП «Поречье Белкоопсоюза»,* **проводимом 14 апреля 2016 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 10 (десяти) дней с назначенной даты проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) дней с момента заключения договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **14.04.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 12.04.2016 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.12.2015.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

